КУЛЬТУРА

штотыднёвая грамадска-палітычная газета | выдаецца з кастрычніка 1991 года | № 43 (1639) | 3 лістапада 2023 г.

Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына...

Працяг тэмы на стар. 4

Гальшанскі замак у Ашмянскім раёне. Фота БелТА

Мы хочам жыць мірна

Мы ваяваць не хочам, мы хочам жыць мірна.
Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка
27 кастрычніка падчас рабочай паездкі ў Мінскі раён.

Спярша Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з падыходамі да ўзвядзення індывідуальнага жылля для грамадзян індустрыяльным метадам. Пры гэтым было абазначана галоўнае — усё неабходна рабіць без цыганіны і без лішніх затрат. Акрамя будоўлі, падчас паездкі закраналіся і іншыя тэмы. Пытанні, якія хвалююць усіх, агучылі журналісты.

Так, Прэзідэнт расказаў, што мае намер зладзіць нараду па рэгуляванні цэн.

— У найбліжэйшы час (у бягучым годзе дакладна, будзе залежаць ад камандзіровак) мы правядзём нараду і ўжо не тое што ўвогуле паразважаем, а паглядзім ужо, што ўрад зрабіў за гэты час, каб мы маглі цэны трымаць каля сябе, за руку.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што інфляцыя ў Беларусі цяпер — прыкладна 3 %. Чакалася, што будзе вышэйшай, але яшчэ ёсць над чым працаваць.

— Можа, яна крыху і падрасце да новага года, але гэта не 9 % будзе. Гэта мы ў два разы скарацілі рост цэн, скарацілі інфляцыю, — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка лічыць правільным рэгуляванне цэн, але “данастройку гэтага механізма” трэба весці пастаянна.

Таксама падчас размовы з журналістамі была ўзнята тэма канфлікту на Украіне.

— Трэба садзіцца за стол перагавораў і дамаўляцца, — упэўнены Аляксандр Лукашэнка. — Як я калісьці гаварыў, не трэба папярэдніх умоў. Галоўнае — далі каманду “Стоп”. Вось з нуля гадзін — стоп: ніякія войскі не рухаюцца, ніхто не страляе, рэзервы ніхто не падкідвае, камунікацыі не аднаўляюць. Спыніліся і вядзём перагаворы. Перагаворы аб чым — аб зямлі і аб міры.

Выказаўся Прэзідэнт і наконт сітуацыі на Блізкім Усходзе:

— Гэта бяда. Блізкі Усход — тут заўсёды быў тэатр ваенных дзеянняў, калі ўзарвецца, то там будзе горача ўсім.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ЗША спрабуюць рабіць палітыку ў каламутнай вадзе, каб захаваць дамінуючае становішча ў свеце. Дзеля гэтага амерыканцы садзейнічаюць абвастрэнню розных супрацьстаянняў.

Аляксандр Лукашэнка лічыць неабходным стварыць палесцінскую дзяржаву, і гэта дапаможа вырашыць канфлікт на Блізкім Усходзе.

Прэзідэнт запэўніў: нават на фоне гэтых падзей у нашай краіне грамадзянам забяспечаць нармальнае жыццё.

Лідар заявіў, што Беларусь настроена на мір з усімі суседзямі, іншымі краінамі і не жадае ваяваць.

— Паціскаем рукі і будзем паціскаць тым, хто хоча жыць з намі ў міры. Мы ваяваць не хочам. Вы ведаеце, мы можам адказаць. У нас ёсць чым адказаць як ніколі, — падкрэсліў Кіраўнік дзяржавы. — Але мы не хочам ваяваць. Таму што гэты адказ дорага нам абыдзецца. Трэба разумець: у выпадку сутыкнення людзі загінуць і з таго, і з іншага боку. Таму мы ваяваць не хочам, мы хочам жыць мірна.

Падрабязней — на сайце president.gov.by

З клопатам аб спадчыне

Чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў ведамства адбылася 1 лістапада. Дзякуючы відэасувязі, да сходу далучыліся таксама начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

На пасяджэнні гаварылі пра перспектывы рэстаўрацыі ў Бабруйскай крэпасці. На дадзены момант распрацавана праектная дакументацыя па трэцім палігоне, мяркуецца, што гэты аб'ект можа быць уключаны ў Дзяржаўную інвестыцыйную праграму на наступны год. Таксама разглядалася магчымасць аднаўлення фрагмента фрэскавага роспісу ў полацкім Сафійскім саборы.

Акрамя таго, закраналіся пытанні правядзення Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Музейныя ініцыятывы на прасторы СНД”, якая адбудзецца 9 і 10 лістапада. Мерапрыемствы першага дня пройдуць у Выканаўчым камітэце СНД у Мінску, а другога — у Нацыянальным гісторыка-культурным музеі-запаведніку “Нясвіж”. Плануецца, што такі з'езд будзе ладзіцца раз на тры гады пры падтрымцы Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД.

Для прафесіяналаў і аматараў кінамастацтва

Як ідзе падрыхтоўка да XXIX Міжнароднага фестывалю “Лістапад”, абмеркавалі ў Выканаўчым камітэце СНД у Мінску.

Пасяджэнне Савета пастаянных паўнамоцных прадстаўнікоў дзяржаў — удзельніц СНД пры статутных і іншых органах Садружнасці адбылося 31 кастрычніка. Акрамя іншых важных пытанняў, разглядалася арганізацыя XXIX Мінскага міжнароднага кінафестывалю “Лістапад”, які распачнецца 17 лістапада ў беларускай сталіцы.

— Выканкам СНД традыцыйна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы і правядзенні гэтага форуму, — адзначыў генеральны сакратар СНД Сяргей Лебедзеў. — Мы заснавалі нават свой прыз, які ўручаем штогод па выніках фестывалю. “Лістапад” сапраўды стаў добрай пляцоўкай для сустрэчы артыстаў, рэжысёраў, сцэнарыстаў. Форум адлюстроўвае прагрэсіўныя павевы ў мастацтве. Тут прапагандуюцца і прадстаўляюцца творчыя набыткі, блізкія да людзей, да жыцця. Менавіта таму гэты фестываль карыстаецца папулярнасцю, знаходзіць водгук у сэрцах і канкурсантаў, і кінаглядачоў.

У пасяджэнні савета прыняў удзел міністр культуры Беларусі. Падчас выступлення Анатолій Маркевіч падкрэсліў, што сёлетні “Лістапад” аб'яднае ў нашай краіне прафесіяналаў і аматараў кіно ўжо ў 29-ы раз і пацвердзіць сваю моцную пазіцыю ў фестывальным руху. Міністр культуры акцэнтаваў увагу, што кінафорум ладзіцца пад патранажам Кіраўніка дзяржавы Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі, дзякуючы чаму сярод узнагарод ёсць прэстыжныя спецыяльныя прызы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “За захаванне і развіццё традыцыйнай духоўнасці ў кінамастацтве” і “За гуманізм і духоўнасць у кіно”.

— “Лістапад” — не толькі пляцоўка для прагляду фільмаў, але і інтэрнацыянальная адукацыйная платформа. Падчас фестывалю праводзяцца майстар-класы, дыскусіі, выставы і творчыя сустрэчы, накіраваныя на навучанне моладзі і абмеркаванне праблем у развіцці кінагаліны, — сказаў Анатолій Маркевіч. — Тут заўсёды пануе атмасфера творчай свабоды, нястомнага духоўнага пошуку і абсалютна сумленнага спаборніцтва. Сёлета конкурсная праграма дапоўнена намінацыяй “Кіно маладых”, якая стане пляцоўкай для адкрыцця новых талентаў.

Міністр адзначыў, што склад удзельнікаў “Лістапада” расце з году ў год і гэта наглядна пацвярджае аўтарытэт мінскага форуму сярод прафесіяналаў і аматараў кінамастацтва.

— Кінематограф не мае меж. Ён заклікаў аб'ядноўваць свет і садзейнічаць узаемаразуменню паміж людзьмі, таму прыемна ўсведамляць, што гэты год чарговы раз стаў для нас рэкордным па колькасці краін-удзельніц. У дырэкцыю фестывалю паступіла больш за 2000 заявак са 107 краін, у тым ліку з краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў: Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі, Таджыкістана, Туркменістана і Узбекістана. З асаблівым задавальненнем хацелася б адзначыць, што названыя дзяржавы з'яўляюцца заўсёднікамі фестывалю, — сказаў Анатолій Маркевіч.

Удзельнікі пасяджэння высока ацанілі якасць падрыхтоўкі “Лістапада”, падзякавалі за тое, што Беларусь падтрымлівае і развівае культурнае мерапрыемства сусветнага маштабу.

Анатолій Маркевіч таксама адказаў на пытанні, зададзеныя прадстаўнікамі пасольстваў дружалюбных краін, і ад імя Міністэрства культуры запрасіў наведаць фестываль, які разгорнецца ў Мінску з 17 па 24 лістапада.

Культурная дыпламатыя ў лічбах

2000 заявак паступіла ў дырэкцыю XXIX Мінскага міжнароднага кінафестывалю “Лістапад” (больш за)

107 краін прадставяць фільмы ў конкурснай праграме

10 дзяржаў-удзельніц СНД зв'яўляюцца заўсёднікамі беларускага кінафоруму

У межах сумесных праектаў

Дні культуры Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь стартавалі ўчора ў Брэсце.

Акрамя ўрачыстага адкрыцця свята, у горадзе над Бугам прайшло сумеснае пасяджэнне калегій міністэрстваў культуры Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.

Мерапрыемствы распачаліся 2 лістапада: у мемарыяльным комплексе “Брэсцкая крэпасць-герой” усклалі кветкі і высадзілі алею ліп. Ва ўрачыстасцях прынялі ўдзел дэлегацыя Расійскай Федэрацыі, члены калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, начальнікі упраўленняў культуры аблвыканкамаў ды Мінскага гарвыканкама.

Пазней у Брэсцкім аблвыканкаме адбылося сумеснае пасяджэнне калегій міністэрстваў культуры Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі.

Сярод іншага падчас сходу абмяркоўваліся выкананне плана супрацоўніцтва паміж міністэрствамі на 2022—2024 гады, перспектыўныя кірункі сумеснай работы ў рамках Саюзнай дзяржавы на 2024—2026 гады, гастролі Моладзевага беларуска-расійскага сімфанічнага аркестра, стварэнне лічбавай бібліятэкі Саюзнай дзяржавы, актывізацыя супрацоўніцтва ў сферы кінематаграфіі, фарміраванне адзінага беларуска-расійскага гастрольнага плана, правядзенне фестываляў, абменных гастроляў, рэалізацыя сумесных праектаў тэатраў і канцэртных арганізацый, супольная дзейнасць па духоўна-маральным збліжэнні народаў Беларусі і Расіі, па недапушчэнні фальсіфікацыі гісторыі і па захаванні гістарычнай праўды, здзяйсненне сумесных выставачных праектаў, накіраваных на фарміраванне агульнай культурнай прасторы, і арганізацыя сумесных мерапрыемстваў да 80-годдзя вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нацысцкіх захопнікаў і 80-годдзя Перамогі.

Увечары ў Брэсцкім акадэмічным тэатры драмы правялі ўрачыстае адкрыццё Дзён культуры Расіі ў Беларусі і канцэрт Дзяржаўнага камернага аркестра джазавай музыкі імя А. Лундстрэма (Расія). На 3 лістапада для ўдзельнікаў форуму запланаваны наведванне мемарыяльнага комплексу “Брэсцкая крэпасць-герой” з экскурсійнай праграмай, пасадка дрэў, візіт у Моладзевы патрыятычны цэнтр.

Падчас здымак

Прастора для шчырай гутаркі

Прэм'ера на YouTube-канале “Культура і Мастацтва”! Разам з Міністэрствам культуры, Беларускай дзяржаўнай акадэміяй мастацтваў і дзіцяча-юнацкай тэлестудыяй Мінскага дзяржаўнага палаца дзяцей і моладзі мы запусцілі новы праект — “Прэс-клуб — Культура і Моладзь”.

У рамках праекта юныя журналісты змогуць звярнуцца з актуальнымі пытаннямі да вядомых асоб нашай краіны, дзеячаў мастацтва. Першым госцем стаў міністр культуры Анатолій Маркевіч. Тэмай яго гуткі з навучэнкай Мінскага дзяржаўнага палаца дзяцей і моладзі Лізаветай Райкевіч сталі сямейныя каштоўнасці. І недарма: нядаўна ў краіне святкаваўся Тыдзень бацькоўскай любові.

Падчас інтэрв'ю Анатолій Мечыслававіч прыгадаў маленства, уклад мамы і таты ў выхаванне і станаўленне, расказаў пра дамашнія звычаі, падзяліўся ўласным досведам бацькоўства. Разважаючы аб ролі сям'і, міністр падкрэсліў: менавіта бацькі задаюць сістэму каардынат, у якой існуе асоба, менавіта ў дзяцінстве выгадоўваюцца пачуцці дабрыні, павагі да старэйшых і любові да Радзімы.

Хто стане наступным госцем праекта? Сачыце за анонсамі ў Telegram-канале “Культура і Мастацтва” і рыхтуйце пытанні. Аўтара найцікавейшых чакае прыз ад рэдакцыі.

Першы выпуск праекта “Прэс-клуб — Культура і Моладзь”

Дырэктар РВУ “Культура і мастацтва” Наталля Кузняцова ўручае кветкі Ягору Жукоўскаму

Два тыдні запар у Telegram-канале “Культура і Мастацтва” разыгрываліся квіткі ў Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

Удзельнікам віктарыны неабходна было адказаць на восем пытанняў па № 41 газеты “Культура”. Шмат падпісчыкаў далучылася да імправізаванага конкурсу, аднак першымі дакладныя адказы даслалі намеснік дэкана па вучэбнай рабоце БНТУ Ягор Жукоўскі і перакладчыца Яўгенія Дзеранок з Мінска.

Разам у Вялікі

Ягор даўно чытае нашу газету, таму слушна выканаць усе заданні ён здолеў без асаблівых намаганняў. Пераможца заўсёды з задавальненнем наведвае Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь, таму атрымаць квіткі на оперу “Любоўны напой” яму было вельмі прыемна.

Яўгенія пазнаёмілася з “Культурай” дзякуючы маці, а цяпер купляе кожны нумар і з цікавасцю чытае тэатральныя рубрыкі. Інтарэс да выдання дапамог дзяўчыне папоўніць сваю тэатральную “скарбонку” операй “Сівая легенда”.

У другой віктарыне па № 42 газеты “Культура” шчаслівым уладальнікам квіткоў на оперу “Севільскі цырульнік” стала эканаміст Марына Чарнуха. Прыемнага прагляду!

Далучайцеся да Telegram-канала “Культура і Мастацтва” і наведвайце Вялікі.

У гонар заступніцы

У Нацыянальным мастацкім музеі адкрылася выстава па выніках міжнароднага пленэру “Святасць зямлі беларускай”, прысвечанага 850-годдзю са скону прападобнай Ефрасінні Полацкай, а таксама Году міру і стварэння.

У экспазіцыі прадстаўлены розныя жанры: пейзажы, нацюрморты, сюжэтныя і сімвалічныя кампазіцыі. Частка работ распавядае пра жыццёвы шлях Ефрасінні Полацкай. Агулам прэзентавана каля паўсотні карцін, выкананых мастакамі з Беларусі, Расіі і Малдовы. Сярод аўтараў ёсць як вопытныя майстры, так і маладыя творцы. Разам з працамі прафесіяналаў выстаўлены малюнкі пераможцаў рэспубліканскага дзіцячага конкурсу, што адбыўся ў рамках пленэру.

Арганізатарамі мерапрыемства з'яўляюцца Беларуская праваслаўная царква, Беларускі саюз мастакоў, Беларускі саюз журналістаў ды іншыя ўстановы. У межах пленэру ўдзельнікі наведалі Спаса-Ефрасіннеўскі жаночы манастыр у Полацку і святыні горада, Івянецкі дом-інтэрнат для дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Адбыўся дабрачынны аўкцыён, сродкі ад якога пайшлі на сацыяльны праект “Масткі — дзецям лета”. Убачыць работы па выніках пленэру ў Нацыянальным мастацкім музеі можна да 3 снежня.

Каму пуцёўку?

Рэгіянальныя праслухоўванні на конкурсы Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску” стартуюць у лістападзе.

Паспрабаваць сілы могуць грамадзяне нашай краіны: моладзь ва ўзросце ад 18 да 31 падае заяўкі на конкурс эстрадных выканаўцаў, хлопчыкі і дзяўчынкі ад 8 да 14 гадоў — на дзіцячы. Удзельнікам трэба мець вопыт канцэртных выступленняў, узнагароды міжнародных або рэспубліканскіх праектаў.

Барацьба за пуцёўкі на “Славянскі базар” пачнецца 21 лістапада ў Магілёве. Найлепшых выканаўцаў Мінчыны вызначаць 30 лістапада. На пачатку зімы адборачныя туры правядуць у астатніх рэгіёнах. У сталіцы адгледзяць таленты 11 снежня. Конкурс зладзяць у канцэртнай зале “Верхні горад”.

Фіналы нацыянальных адбораў, на якіх і вызначаць прадстаўнікоў Беларусі на “Славянскім базары ў Віцебску” 2024 года, адбудуцца ў сакавіку. Дарэчы, сёлетні фестываль мастацтваў вылучыўся для краіны высокімі ўзнагародамі. І на дзіцячым, і на дарослым конкурсах першую прэмію ўзялі нашы — Сафія Рустамава і Самір Ёлчыеў.

Сустрэча ў Астраўцы

Прасачыць за ходам аднаўлення

Чым прывабіць вандроўнікаў Гродзеншчына?

Удзельнікі калегіі Міністэрства культуры на чале з міністрам Анатоліем Маркевічам 26 кастрычніка наведалі Гродзенскую вобласць. На выязным пасяджэнні, якое адбылося ў Астраўцы, прайшло абмеркаванне інвестыцыйнай праграмы, работ па капітальным рамонце на аб'ектах культуры, якія фінансуюцца за кошт рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, а таксама ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы. Удзел у пасяджэнні ўзялі начальнікі структурных падраздзяленняў Міністэрства культуры і ўпраўленняў культуры аблвыканкамаў ды Мінскага гарвыканкама, а таксама заказчыкі і падрадчыкі па выкананні работ на гістарычных помніках.

ВЯРТАННЕ КНЯЖАЦКАЙ ВЕЖЫ

Але перш госці Гродзеншчыны наведалі два значныя аб'екты, на якіх сёння працягваюцца аднаўленчыя работы, — Крэўскі і Гальшанскі замкі. Як адзначыў міністр культуры Анатолій Маркевіч, гэтыя помнікі — сведчанні глыбокай гістарычнай мінуўшчыны і багатай культурнай спадчыны нашай краіны. Дзяржава надае вялікую ўвагу аднаўленчым работам, на гэтыя мэты выдзяляюцца істотныя фінансавыя сродкі. Напрыклад, у аднаўленне Крэўскага замка ўжо ўкладзена больш за 5,5 мільёнаў рублёў. Работы выконваюцца вельмі дынамічна, прытым з захаваннем усіх неабходных норм. У наступным годзе мы выйдзем на завяршальны этап па абнаўленні перыметра замка. Пасля гэтага ў планах рэстаўрацыя Княжацкай вежы і яе музеефікацыя. У асноўнай экспазіцыі будуць прадстаўленыя артэфакты, знойдзеныя тут падчас археалагічных даследаванняў.

Адноўлены камін у вежы Гальшанскага замка

У Крэве ўдзельнікаў калегіі віталі старшыня райвыканкама Генадзь Харужык, намеснік старшыні Ігар Шчасны і начальнік аддзела спорту і турызму Аляксандр Лобан. Як паведаміла начальнік аддзела культуры Таццяна Ражава, да канца бягучага года мусіць быць завершаная кансервацыя з рэстаўрацыяй паўднёва-заходняй сцяны замка. На гэты момант завершаны каменны мур, які выканалі работнікі ААТ "Белрэстаўрацыя", наступным этапам будзе аднаўленне паўднёва-ўсходняй сцяны. Сёлета замак наведалі больш за пяць тысяч турыстаў, толькі на брэндавым свяце "Кераміка Крэва" пабывалі больш за паўтары тысячы чалавек.

АДЗІНЫ МАРШРУТ

Затым удзельнікі калегіі прыехалі ў Гальшанскі замак Ашмянскага раёна. На гэтым аб'екце вядуцца работы па кансервацыі з фрагментарнай рэстаўрацыяй. На паўночна-ўсходнім корпусе завяршаюцца работы па рэстаўрацыі цаглянага мура, кансервацыі вонкавых сцен, на паўночна-заходнім корпусе — супрацаварыйныя і кансервацыйныя работы. Завершана будаўніцтва Паўночнай вежы, у якой дзейнічае музейная экспазіцыя.

Гасцей сустрэлі намеснікі старшыні Ашмянскага райвыканкама Андрэй Клышэўскі і Юрый Снесар. Як адзначыла начальнік сектара культуры Вольга Барысенка-Рабко, дзякуючы падтрымцы дзяржавы руіны замка паступова набываюць новае жыццё, робячыся не толькі месцам, авеяным легендамі і паданнямі, але і цэнтрам культурна-пазнавальнага турызму ў рэгіёне. За час работы філіяла з мая 2021 па верасень 2023 года экспазіцыю ў Паўночнай вежы ўбачылі больш за 47 тысяч турыстаў з Беларусі і замежных краін. Колькасць наведвальнікаў штогод павялічваецца, укараняюцца новыя паслугі і формы работы.

Як адзначыла начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама Алена Клімовіч, вельмі важна, што ўсе аднаўленчыя працы, якія вядуцца на гістарычных аб'ектах Гродзеншчыны, не закрываюць магчымасць наведвання іх турыстамі. Гальшанскі замак — асабліва паказальны прыклад у гэтым дачыненні, тут умела спалучаюць гэтыя два напрамкі работы, прытым выкарыстоўваюць аб'ект і для гістарычных экскурсій, і як пляцоўку для масавых мерапрыемстваў. Анатолій Маркевіч падкрэсліў, што важна наладжваць узаемадзеянне паміж раёнамі і сумесна распрацоўваць турыстычныя маршруты — такі сістэмны падыход дапаможа больш пагрузіць турыстаў у гісторыю рэгіёна.



ТРАДЫЦЫЙНЫ ПАЧАСТУНАК

У Астраўцы ўдзельнікі калегіі азнаёміліся з работай шматфункцыянальнага комплексу сацыяльна-культурнага прызначэння і творчасці моладзі, дзе кампактна размясціліся цэнтр культуры, аддзел рамёстваў, гісторыка-краязнаўчы музей, 3D-кінатэатр, бібліятэка і памяшканні для гуртковай работы. Гасцей тут сустракалі караваем са збожжа новага ўраджаю. Загадчык Рымдзюнскага сельскага клуба-бібліятэкі Наталля Недалтоўская распавяла пра захаванне народных традыцый у гервяцкім краі, а фальклорны калектыў "Жыльвіціс" пацешыў гасцей народнымі песнямі і танцамі. Было чым здзівіць удзельнікаў калегіі і майстрам цэнтра культуры і народнай творчасці — яны зладзілі паказ адзення ручной работы, а ў бібліятэцы госці паглядзелі пастаноўку з паэмы Якуба Коласа "Новая зямля" і пачаставаліся кавай з жалудоў.

Як адзначыў у сваім выступе на пасяджэнні калегіі Анатолій Маркевіч, пытанні будаўнічага комплексу заўжды знаходзяцца ў цэнтры ўвагі кіраўніцтва і супрацоўнікаў сферы культуры. Гэта не проста аб'екты, за гэтым стаіць глыбокі сэнс, які заключаецца ў тым, наколькі мы з'яўляемся праваднікамі ідэй, звязаных з захаваннем гістарычнай памяці і культурнай спадчыны, наколькі глыбока пранікаем у нашу гісторыю. Штогод у дзяржаўнай праграме з'яўляецца шэраг аб'ектаў, якія падлягаюць рэстаўрацыі ці рэканструкцыі, сёлета такіх налічваецца 13, станам на пачатак кастрычніка на іх выдзелены з рэспубліканскага бюджэту 33,2 мільёна рублёў.

Працягваецца кансервацыя замка ў Гальшанах

ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

З асноўным дакладам выступіў начальнік упраўлення капітальнага будаўніцтва Міністэрства культуры Аляксандр Бартошык. Сёлета працягваюцца работы ў комплексе Нацыянальнага мастацкага музея, з пачатку работ на гэты аб'ект вылучана 38,7 мільёна рублёў. На будаўніцтва корпуса Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя А.К. Глебава накіравана 19,4 мільёна рублёў, будаўнічая гатоўнасць аб'екта сёння складае 70 %. На работы ў палацава-паркавым комплексе ў Ружанах Пружанскага раёна было накіравана больш за 5 мільёнаў рублёў, будаўнічая гатоўнасць таксама складае 70 %.

На рэстаўрацыю касцёла Божага Цела ў Нясвіжы з пачатку работ накіравана 13,7 мільёна рублёў, а на рэканструкцыю і рэстаўрацыю Спаса-Праабражэнскай царквы ў Полацку — 3,8 мільёна рублёў, сёння тут працягваюцца работы па рэстаўрацыі фасадаў і роспісаў у інтэр'еры. Па комплексе былога калегіума езуітаў у Юравічах Калінкавіцкага раёна вядзецца распрацоўка праектнай дакументацыі, завершаныя работы па распрацоўцы праектна-сметнай дакументацыі для рэстаўрацыі Свята-Аляксандра-Неўскай царквы ў Мінску. На работы ва Успенскім саборы ў Жыровічах з пачатку работ вылучана 10,6 мільёна рублёў, будаўнічая гатоўнасць аб'екта складае 90 %. На работы на Навагрудскім замку вылучана 5,5 мільёна рублёў, будаўнічая гатоўнасць складае 70 %, сёння працягваюцца работы па ўмацаванні руін вежаў і аднаўленні замкавага мура. На работы ў канцэртным зале "Віцебск" вылучана 24,1 мільёна рублёў, будаўнічая гатоўнасць аб'екта складае 50 %.

За дзевяць месяцаў 2023 года арганізацыямі культуры і ўстановамі адукацыі ў сферы культуры закуплены 383 музычны інструмент на агульную суму 1,8 мільёна рублёў. Пад кіраўніцтвам намесніка міністра Сяргея Саракача была праведзеная істотная работа ў гэтым напрамку і распрацаваная новая методыка падліку забяспечанасці музычнымі інструментамі. Таксама для закупкі піяніна была зладжаная дабрачынная акцыя, прымеркаваная да Міжнароднага дня абароны дзяцей, і задзейнічаная спонсарская дапамога. Акрамя таго, закуплена светлавое, гукавое і іншае абсталяванне, а таксама музычныя інструменты на суму 15,2 мільёна рублёў.

Падчас пасяджэння таксама быў адзначаны шэраг пытанняў, якія патрабуюць вырашэння для паспяховага завяршэння работ на аб'ектах. Удзельнікі калегіі заявілі сваё знаёмства з Астравеччынай, наведаўшы пасля помнікаў гісторыі яшчэ і адзін з найцікавейшых сучасных аб'ектаў рэгіёна — Беларускую атамную электрастанцыю, дзе здолелі азнаёміцца з гісторыяй гэтага прадпрыемства і работай яго персаналу. Так госці здолелі пераканацца, што рэгіён развіваецца і, абапіраючыся на даўнія традыцыі, упэўнена глядзіць у будучыню. Раім усім наведаць гістарычныя мясціны Гродзеншчыны і таксама ўпэўніцца на ўласным досведзе, які магутны турыстычны патэнцыял мае гэтая зямля.

Антон РУДАК

Крэўскі замак

Як разлічыць сабекошт?

У Прэс-клубе рэдакцыйна-выдавецкай установы "Культура і мастацтва" 25 кастрычніка адбылася відэаканферэнцыя на тэму "Пастанова № 608: эканамічны складнік у справе арганізацыі і правядзення культурна-відовішчных мерапрыемстваў". На пытанні гледачоў трансляцыі адказала начальнік фінансава-эканамічнага ўпраўлення Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Святлана Крупко.

Эканамічны складнік правядзення культурна-відовішчных мерапрыемстваў рэгламентуецца метадычнымі рэкамендацыямі па калькуляцыі сабекошту паслуг у арганізацыях культуры і ўстановах адукацыі ў сферы культуры, зацверджаным 29 сакавіка 2010 года. Гэты дакумент змяшчае звесткі аб складзе затрат, якія ўключаюцца ў сабекошт паслуг, што мусіць быць аказаная. Да такіх затрат адносіцца сабекошт, які ўключае матэрыялы, паліва, электраэнергію, нематэрыяльныя затраты, працоўныя рэсурсы ў выглядзе заработнай платы і налічэнняў на заработную плату.

У суму прамых затрат могуць уваходзіць арэнда пляцоўкі для правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства, кампенсацыя камунальных паслуг, узнагароджанне ўдзельнікам мерапрыемства або аўтарскія ўзнагароджанні. Таксама існуюць ускосныя затраты, якія размяркоўваюцца для бюджэтных арганізацый у пэўнай прапорцыі ў адпаведнасці з уліковай палітыкай канкрэтнай арганізацыі. Таксама сюды можа ўключацца рэнтабельнасць.

— На якія нюансы ў пунктах калькуляцыі найперш могуць звярнуць увагу рэвізоры ў выпадку яе некарэктнага складання?

— Пры складанні калькуляцыі ўсе ўключаныя затраты мусяць быць эканамічна абгрунтаваныя дамовамі, вывучэннем кан'юнктуры рынка альбо іншымі сродкамі, якія могуць патлумачыць, чаму тая ці іншая сума была ўключаная ў калькуляцыю. Што тычыцца ўскосных затрат, у дачыненні да іх патрабуецца выкананне лакальнага нарматыўнага акта, прынятага ў вашай арганізацыі

— Ці можна закладваць у калькуляцыю аплату працы супрацоўнікаў установы, якія арганізуюць мерапрыемства, ці толькі артыстаў, якія ўдзельнічаюць у ім?

— Так, калі такую аплату можна разлічыць прамым метадам. Калі не — то ўскосным метадам, у адпаведнасці з уліковай палітыкай арганізацыі.

— Калі бюджэтная арганізацыя — арганізатар у кафэ, яму трэба пакрываць выдаткі ў бюджэт. Ці можам мы адразу закласці гэта ў каштарыс?

— У такім выпадку даход, які будзе атрыманы, будзе ўключацца ў выручку і размяркоўвацца ў адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў № 641 "Аб пазабюджэтных сродках бюджэтных арганізацый" ад 19 ліпеня 2013 года. Складаючы калькуляцыю, неабходна закласці як прамыя і ўскосныя затраты, так і пэўны памер прыбытку.

— Якім чынам уключаць у калькуляцыю харчаванне артыстаў пры выкананні бытавога райдара?

— У адпаведнасці з вызначанымі нормамі харчавання ўдзельнікаў пры правядзенні камерцыйных мерапрыемстваў. Гэтая сума ўваходзіць у прамыя затраты.

— Ці можа адрознівацца папярэдняя калькуляцыя ад канчатковай (выніковай) па факце правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства?

— Так, можа. Пасля робіцца ўдакладненне — і складаецца фактычная калькуляцыя. Зазвычай гэта робіцца ў межах каштарысных назначэнняў. У каштарысе можа быць зробленая зноска, што дапускаецца пераразмеркаванне сродкаў.

Адданасць школе і заўсёдны пошук

Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў сабраў найбольш яркія набыткі айчынных творцаў за апошнія тры гады. Ва ўстанове адкрылася экспазіцыя па выніках Нацыянальнай прэміі ў галіне выяўленчага мастацтва. Выстава адлюстроўвае багацце кірункаў, размаітую палітру тэм і тэхнік, да якіх звяртаюцца беларускія аўтары.

Рэспубліканскі конкурс быў заснаваны Міністэрствам культуры ў 2017-м і ладзіцца кожныя тры гады. Штораз ён даводзіць магутнасць айчыннай школы і ў той жа час поспехі ў наватарскіх пошуках. Нароўні з працамі ў традыцыйным рэчышчы заўсёды прэзентаваны калі не прарыўныя эксперыменты, то ўдалыя спробы ўзбагаціць ранейшы досвед свежымі пластычнымі знаходкамі ды ракурсамі для разгляду спрадвечных пытанняў. У экспазіцыі прадстаўлены жывапіс, графіка, скульптура, дызайн, манументальнае, манументальна-дэкаратыўнае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Побач з набыткамі аўтарытэтных майстроў дэманструюцца выказванні маладзейшых — тых, хто толькі робіць першыя крокі і хто ўжо назапасіў паважнае партфоліа. У намінацыі "Творчы дэбют" удзельнічаюць аўтары да 31 года. Некаторыя з іх ужо ўдастоіліся права на персанальную выставу ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў. Таццяна Савік у серыі VOID разважае аб фрагментарнасці ўспрымання сябе і іншых, праз разрывы і паўзы на жывапіснай паверхні імкнецца адлюстраваць пустату. Лізавета Янкова прысвяціла дыптых "Чароўная прастора зямнога жыцця" глабальным падзеям у развіцці чалавецтва — пераходу ад збіральніцтва і палявання да земляробства і жывёлагадоўлі. Фёдар Шурмялёў у літаграфіях прапануе адметны погляд на старажытнагрэчаскі міф пра Тэсея. Хараство беларускай прыроды апявае ў краявідах-панарамах Ганна Садоўская. Сувязь стыхій і чалавечых тыпаў тэмпераменту даследуе Дарына Даўгадзіліна. Анастасія Чадзій нібы запрашае гледача звярнуцца да дзіцячых успамінаў пра вясковыя канікулы ў бабулі ды падумаць пра сямейную цеплыню.

Значнае месца адведзена творам ваеннай тэматыкі. Здаецца, трагічныя падзеі XX стагоддзя асэнсаваны ў беларускім мастацтве спаўна. Аднак аўтары розных пакаленняў здольныя сказаць новае слова пра ліхалецце. Прыкладам, Усевалад Швайба серыяй літаграфій "Хатынь" узбагаціў фонд мастацкіх прысвячэнняў усім нявінна забітым. Раней работа ўжо была адзначана на рэспубліканскім конкурсе на найлепшы культурны праект патрыятычнай тэматыкі. Гістарычную падзею сусветнага маштабу праз лёсы асобных людзей разглядаюць жывапісцы Уладзімір Уродніч і Мікалай Апіёк. Адлюстраванне трагедыі 1940-х у манументальным мастацтве — мемарыял на месцы масавага забойства вязняў гета ў Дзяржынску — прадставіў скульптар Аляксандр Шапо. Павел Кашэўскі развіў хатынскую тэму ў плакаце.

Мноства экспанатаў — гэта мастакоўскія прысвячэнні нацыянальнай спадчыне, славутым асобам беларускай зямлі. Ганна Конанава прэзентавала кампазіцыйны партрэт "Віталь Цвірка. Думкі аб Радзіме". Серыю "Прысвячэнне Максіму Багдановічу" на суд экспертаў і гледачоў вынес скульптар Сяргей Гуміле́ўскі.

Бліжэй пазнаёміцца з намінантамі на прэмію можна да 26 лістапада. Экспазіцыю будуць суправаджаць сустрэчы з аўтарамі, прэзентацыі, майстар-класы і іншыя імпрэзы. Імёны трыумфатараў даведаемся незадоўга да закрыцця выніковай выставы. Пакуль жа журы працягвае працу.

Ганна Садоўская. Трыпціх "Блакіт" (цэнтральная частка)

Ганна Конанава. "Віталь Цвірка. Думкі аб Радзіме"

Удзельнікі пленэра

Міжнародны пленэр па жывапісе "Вобраз Радзімы ў выяўленчым мастацтве" завяршыўся на Магілёўшчыне. Удзельнікі з сямі краін адлюстравалі на палотнах уласны погляд на беларускі край. Яднае работы розных стыляў індустрыяльны акцэнт.

Па натхненне — на завод

"Магілёўліфтмаш", "Белшына", Магілёўскі металургічны завод, "Чырвоны харчавік", "Александрыйскае" — вядучыя прамысловыя і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы вобласці прынялі беларускіх і замежных мастакоў. Жывапісцы пазнаёміліся з сакрэтамі вытворчасці і папрацавалі за эцюднікамі наўпрост у цэхах і на нівах. Выбар лакацый невыпадковы: пленэр у гонар Года міру і стварэння быў прысвечаны тэме "Магілёўшчына індустрыяльная".

Менавіта заводскай эстэтыкай зацікавіўся ўдзельнік з Расіі Мікалай Базуноў. У нашай краіне ён пабываў упершыню. Радыёінжынер па адукацыі вярнуўся да дзіцячага захаплення выяўленчым мастацтвам і праз руплівую працу над сабой вынайшаў арыгінальны почырк, адметны стыль, які называе постіндустрыяльным урбаністычным імпрэсіянізмам.

Побач з удзельнікамі маладога і сярэдняга ўзросту працавалі заслужаныя майстры, што сімвалізуе пераемнасць пакаленняў і дае магчымасць новай генерацыі атрымаць каштоўныя веды ад старэйшых. Першы раз да пленэру ў Прыдняпроўскім краі далучыўся і народны мастак Рэспублікі Каракалпакстан, акадэмік Акадэміі мастацтваў Узбекістана Сарсенбай Байбасынаў. Ён віртуозна стварае як рэалістычныя пейзажы, партрэты ды нацюрморты, так і абстрактныя кампазіцыі. Таксама на Магілёўшчыну завіталі жывапісцы з Арменіі, Казахстана і Кітая. Увогуле з 1996 года да пленэру далучылася звыш 600 чалавек з 38 краін.

Акрамя знаёмства з прамысловасцю рэгіёна, мастакам прапанавалі насычаную культурную праграму. Госці наведалі Музей этнаграфіі, гарадскую ратушу, Свята-Мікольскі жаночы манастыр, пазнаёміліся з іншымі славутасцямі Магілёва і вобласці. Да таго ж творцы змаглі не толькі падзяліцца прафесійнымі сакрэтамі адзін з адным, але і перадаць досвед пачаткоўцам. Жывапісцы пабывалі ў Магілёўскім дзяржаўным каледжы мастацтваў, дзе зладзілі майстар-клас для навучэнцаў і далі інтэрв'ю моладзевай тэлестудыі "Ракурс" пры ўстанове адукацыі.

Па выніках пленэру ў Абласным мастацкім музеі імя П. В. Масленікава разгарнулася выстава "Магілёўшчына індустрыяльная". Удзельнікаў жа ўзнагародзілі ў намінацыях "Рытм вытворчасці", "Вехі слаўнага шляху", "На Дошку гонару", "Рух горада ў часе" і "Ёсць час для рамантыкі". Азнаёміцца з экспазіцыяй можна цягам месяца.

Матэрыялы рубрыкі падрыхтаваў Даніл ШЭЙКА

Падчас канцэрта ў рамках фестывалю "Беларускі кірмаш у Даўгаўпілсе"

Выстава беларускіх лялек на "Восеньскім кірмашы ў Даўгаўпілсе"

Наталіцца родным

Беларусы лічацца другой па колькасці нацыянальнай меншасцю ў Латвіі. І нашы суайчыннікі, што жывуць у краіне-суседцы, зберагаюць памяць пра карані ды знаёмяць іншых са спадчынай сваіх продкаў. Доказ таму — дзейнасць Цэнтра беларускай культуры ў Даўгаўпілсе. Гэта ўнікальная ўстанова, дзе кожны выхадзец з нашага краю можа наталіцца роднай мовай і традыцыямі, праявіць творчыя здольнасці.

Цэнтр беларускай культуры працуе як падраздзяленне Дома Адзінства Даўгаўпілскага гарадскога самакіравання. Установа бюджэтная. Поруч заўсёды ідуць партнёры. Найперш гэта культурнаасветніцкае таварыства "Уздым", якое сёлета адзначыла 30-годдзе. Яднае арганізацыі агульная мэта — захаванне і развіццё беларускай нацыянальнай культуры.

У Міжнародны дзень роднай мовы штогод тут арганізуюць дыктоўку па-беларуску. У анлайн-рэжыме падключаюцца сябры з іншых гарадоў і краін. Сёлета сваю пісьменнасць удзельнікі спраўдзілі, напісаўшы ўрывак з эцюда "Шчасце" Янкі Маўра. Сімвалічна, што гэтаму пісьменніку была прысвечана яшчэ адна падзея да Дня роднай мовы — міжнародная канферэнцыя "Беларускія чытанні" з удзелам даследчыкаў, педагогаў і работнікаў культуры.

Цэнтр ладзіць народныя святы, літаратурныя вечарыны, выставы, экскурсіі ды іншыя імпрэзы. Пры ім існуюць калектывы мастацкай творчасці, бібліятэка і музей. Экспазіцыя пераносіць наведвальнікаў у вясковую хату канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Там паказаны прадметы побыту і прылады працы, узоры вышыўкі і ткацтва, ганчарныя вырабы. Дзіцячым групам не толькі правядуць экскурсію, але і прапануюць у карагодзе згуляць у "Падушачку" і "Капялюш", адгадаць загадкі, змайстраваць сувенір з беларускім калярытам.

Яшчэ адна экспазіцыя прысвечана беларускім лялькам. Выраблены яны па традыцыйных тэхналогіях: з ільняной тканіны, нітак, саломы, пакулля. Збіралі калекцыю многія гады. Нешта прывозілі ў падарунак дэлегацыі з нашай краіны, нешта ансамблі з Даўгаўпілся атрымалі на такіх фестывалях, як "Браслаўскія зарніцы", "Жураўлі і журавіны Міёрскага краю", "Дняпроўскія галасы ў Дуброўне".

ФЕСТЫВАЛЬНАЯ ВІЗІТОЎКА

У календары даўгаўпілскіх беларусаў нямала важных дат. Святкуюць Купалле, Гуканне вясны і Каляды, ладзяць Дні беларускай культуры, далучаюцца да гарадскіх і агульнадзяржаўных імпрэз. Але самай яркай падзеі, сапраўднай візітоўкай нацыянальнай суполкі стаўся восеньскі Міжнародны фестываль народнай культуры "Беларускі кірмаш у Даўгаўпілсе". Сёлета ён адбыўся 13-ы раз.

Гледачам прапанавалі выставы восеньскіх дароў, твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Свае карціны прэзентаваў мастак-самавук Аляксей Касінец — ураджэнец Віцебшчыны, які ўжо некалькі дзесяцігоддзяў жыве ў Ліепаі. Таксама ахвочыя паўдзельнічалі ў майстар-класах па вырабе лялек-абярэгаў і паштовак-выцінанак.

З аншлагам прайшоў гала-канцэрт. Распачалі яго творчыя калектывы Цэнтра беларускай культуры: "Купалінка", "Лянок", "Спадчына", "Пралескі", "Скарбніца", "Паўлінка". За імі на сцэну выйшлі самадзейныя ансамблі і салісты з іншых куточкаў Латвіі, госці з Эстоніі, Літвы і Польшчы.

КРАЯВІДЫ АЙЧЫНЫ І ВЫБІТНЫЯ ЗЕМЛЯКІ

Адкрыўся ж чарговы сезон Цэнтра беларускай культуры 5 верасня. Традыцыйна адлік новага творчага года пачаўся з Дня беларускага пісьменства. Штогод каманда змяняе фармат свята. Гэтым разам прэзентавалі выставу да 130-годдзя Максіма Гарэцкага, падрыхтаваную Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры. Цікава, што ў біяграфіі пісьменніка ёсць старонкі, звязаныя з Даўгаўпілсам. У гэтым горадзе ў міжваенны перыяд творца выкладаў на беларускіх настаўніцкіх курсах.

"Адлюстраванне" — так называецца яшчэ адна экспазіцыя, што разнастаіла восеньскую афішу. На калектыўнай выставе паказаны работы ўдзельнікаў аб'яднання "Маю гонар". Гэта суполка прафесійных мастакоў з беларускімі каранямі з Латвіі, Літвы, Эстоніі і Расіі. Увазе наведвальнікаў прапанавалі звыш 20 твораў у розных тэхніках і стылях. Сярод іх нямала краявідаў малой радзімы. Працаваць выстава будзе да канца лістапада.

Колькі слоў варта сказаць пра згаданыя творчыя калектывы. Ансамбль "Купалінка" яднае самадзейных вакалістаў. Пад акампанемент акардэона яны выконваюць народныя песні — не толькі беларускія, але і латышскія ды латгальскія. Ёсць у рэпертуары і аўтарскія песні на роднай мове. Прыкладам, у жніўні кампазіцыі па-беларуску ў выкананні "Купалінкі" прагучалі ў Аўгшдаўгаўскім краі на фэсце да дня нараджэння асветніка і лютэранскага пастара Горхарда Фрыдрыха Стэндэра. Дораць слухачам родныя мелодыі таксама вакальна-інструментальны ансамбль "Пралескі" і харавая капэла "Спадчына". А ў студыі "Скарбніца" да нашай культуры далучаюць дзяцей.

"Лявоніха", "Кадрыля", "Кракавяк", "Падыспань", "Нарэчанька" — мноства народных і стылізаваных танцаў складаюць набытак ансамбля "Лянок". Харэаграфічны калектыў прычыніўся да многіх яркіх фэстаў, у тым ліку ў Беларусі.

Ёсць у нашых суродзічаў у Даўгаўпілсе і тэатральнае згуртаванне. Студыя "Паўлінка" працуе з 2007 года. Аматарская трупа паставіла "Мікітаў лапаць" Міхася Чарота, "Чорт і баба" Францішка Аляхновіча ды іншыя п'есы, гумарыстычныя сцэнкі, рэканструкцыі народных свят. Вядома, ёсць у рэпертуары Купалава "Паўлінка".

ДЫЯЛОГ ПРАЗ МАСТАЦТВА

Не толькі свае традыцыі нясуць у свет беларусы Даўгаўпіла. Цікавяцца спадчынай іншых народаў, шукаюць пункты судакранання. Так, з мэтай дыялогу між прадстаўнікамі розных нацыянальнасцей цэнтр зладзіў праект "Суквецце культур". Разам з сябрамі латышскага і літоўскага таварыстваў адзначалі Каляды, параўноўвалі, шукалі агульнае ў звычаях трох краін. Адбылася сумесная вечарына з прадстаўнікамі яўрэйскай, нямецкай і татарскай абшчын. Разам з палякамі і ўкраінцамі гукалі вясну. А завяршылася маштабная акцыя супольным канцэртам творчых калектываў нацыянальна-культурных таварыстваў Даўгаўпілса.

Даніл ШЭЙКА

У Цэнтры беларускай культуры вітаюць юных гасцей

Чэмпіёнка на доўгіх дыстанцыях

Любіць жыццё "па-зубкоўску"

Сёння — 3 лістапада — народная артыстка Беларусі Зінаіда Зубкова спраўляе цудоўны юбілей — 85 гадоў. З іх 63 (лічыце, усё свядомае жыццё, пачынаючы са студэнцтва) аддадзены Нацыянальнаму акадэмічнаму тэатру імя Янкі Купалы.

У ролі Нявесты ("Вяселле")

"Трэба ўмець радавацца, цаніць прыгажосць, што навокал, чалавечыя зносіны. Ад усяго, што робіш, атрымліваць задавальненне".

Зінаіда Пятроўна сустракае мяне ў белым пухнатым швэдары — сама вязала. Грымёрка нагадвае не службовае памяшканне, а ўтульны хатні пакой з прыветлівай гаспадынькай. На сценах — рэдкія фота ў рамках. Яшчэ стос здымкаў, паштовак (у тым ліку ад легендарнага купалаўца Уладзіміра Уладамірскага), якія актрыса падрыхтавала для размовы, ляжыць у чаканні. Перабіраючы выявы, адчуваеш дотык самога жыцця артысткі, складанага і азоранага любоўю. На адным з фота — Зубкова ў балетнай пачцы.

— Гэта мая Пахіта, — каментуе Зінаіда Пятроўна.

— Пэўна, у дзяцінстве пачыналі з харэаграфіі? Адразу пасля вайны.

— Не-не, я ўпершыню ўбачыла балет у 1956-м, ужо калі ў Мінску вучылася, у тэатральна-мастацкім інстытуце. Цяпер гэта Акадэмія мастацтваў. Свайго будынка ў інстытута тады не было, ён знаходзіўся ў памяшканні opернага тэатра. Я ўбачыла балет — і абамлела. Сказала сама сабе: "Я буду танцаваць!" Праўда, спярша я пайшла ў мастацкую гімнастыку. Яна ў тыя гады была крыху іншай: я больш займалася акрабатыкай, нават працавала са штангай. У мяне і дыплом ёсць за першае месца ў спаборніцтве таварыства "Буравеснік". Увогуле, я заўсёды была спартыўнай дзяўчынкай. Ад бабулі ў горад 14 кіламетраў ездзіла на кані без сядла. Любіла лыжы, была чэмпіёнкай на доўгіх дыстанцыях. На кароткіх не магла сабрацца, затое на доўгіх добра размяркоўвала сілы. А ў Палацы прафсаюзаў працавала балетная студыя, і я аж да 70 гадоў хадзіла туды тры разы на тыдзень. Гімнастыкай і сёння займаюся. Як жа без гэтага? Можа, таму ўвесь час іграла і іграю пераважна высакародных персанажаў, для якіх патрэбныя плечы-ручкі-падбародачак.

— Вашы выправа, хада, пластыка — і дагэтуль як у артыстаў балета. Не дзіва, што ў 75 вы бліскуча сыгралі Нявесту ў пластычным "Вяселлі" па Чэхаве, ды і цяпер паўстаяце своеасаблівым ценем нявесты ў "Жаніцьбе" Гогаля.

— Дык я да 70 і на шпагат садзілася, і вертыкальны шпагат рабіла. Прафесійнай артысткай балета стала мая дачка Вольга: скончыла харэаграфічную вучэльню, працавала ў Дзяржаўным акадэмічным ансамблі танца. А гэтыя дзве ролі, што вы згадалі, мне праўдзе дарагія. "Вяселле" ставіў Уладзімір Панкоў з Масквы. І калі прапанаваў мне Нявесту, я спачатку ўспрыняла гэта як здзек. А потым зразумела, чаму быў патрэбны такі незвычайны ход. Прычым Уладзімір не дабіваўся, каб я паўтарала штосьці за ім, — наадварот, хацеў поўнай свабоды: маўляў, рабіце, як хочаце, а я буду на вас арыентавацца. Калі рэжысёр давярае артыстцы, яна можа горы звярнуць! Памятаю, каманда з Казахстана ставіла фільм пра вайну, і я іграла ў яго маленечкім эпізодзе: трымаю ў падоле бульбу, і немец заколвае мяне штыкам. Здавалася б, трэба ўпасці — і ўсё. Дык я прапанавала, каб спачатку ў кадры была мая рука з бульбінай. Пальцы расціскаюцца, бульбіны падаюць, коцяцца — і я павольна сунуся ўніз, прытуліўшыся да сцяны. А з "Жаніцьбай" яшчэ цікавей выйшла: спачатку мая роля не планавалася. Ставіў гэты спектакль малады Данііл Філіповіч — майстар сучаснага рашэння. Мне было так цікава, што ж ён прыдумае, што я наведвала ўсе рэпетыцыі.

— І чым гэта скончылася?

— Ён папрасіў мяне прайсціся. Проста прайсціся па сцэне — і ўсё. А я ж бачыла ранейшыя рэпетыцыі, таму зразумела, як менавіта належыць гэта зрабіць. І Данііл прыдумаў ролю, якой няма ў Гогаля, — Цень Жаніцьбы. Там не бачна майго твару — толькі фігура і рухі.

— Але менавіта ваша постаць надае спектаклю пранізлівы філасофска-трагедыйны сэнс няспраўджанай мары, чалавечай адзіноты ў свеце людзей. Дарэчы, у вас ужо цэлая калекцыя такіх бязмоўных роляў, якія з другасных узрастаюць да цэнтральных, — праз той змест, што вы ў іх укладаеце. Я маю на ўвазе пастаноўку "Чакана гучна і да болю блізка" на камернай сцэне. У гэтым спектаклі вы іграеце жанчыну ў акенцы.

— Так, я ўвесь час знаходжуся на сцэне: сяджу, ніяк не рухаюся, "размаўляю" з усімі адно вачыма. І ў нейкі момант з іх пачынаюць цячы слёзы. Па маім стане глядач павінен зразумець і мае пачуцці, і нават тое, хто ж я такая. Прычым найбольш кемлівая публіка можа ўцяміць гэта куды раней, чым пляменнік гераіні, які пасля доўгіх гадоў расстання зблытаў яе з іншай.

— На супрацьлеглым полюсе вашай творчасці — безліч вобразаў, увасобленых адным толькі голасам. Я маю на ўвазе работу на радыё. Між іншым, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Беларусі ў 1984-м вы сталі, дзякуючы ролі Марысі ў радыёспектаклі "Хамуціус" па аднайменнай паэме Аркадзя Куляшова.

— Над гэтым радыёспектаклем, які ішоў тры вечары па гадзіне, мы працавалі тры месяцы. Шчыравалі па начах, бо ўсе артысты былі шчыльна заняты ў тэатральных пастаноўках. Запісы вяліся ў Вялікай студыі Дома радыё, кожны з нас стаяў перад сваім мікрафонам — і не было ніякай магчымасці таго партнёрства, да якога мы прывучаны ў тэатры. Не тое што дакрануцца — нават у вочы не зазірнуць. Адзінае, чым мы маглі сабе дапамагчы — гэта рухі рукамі, бо любы жэст — ужо інтанацыя. Я пераймала веды ў народнага артыста Беларусі Канстанціна Саннікава, а ён, у сваю чаргу, заканчваў Беларускую студыю ў Маскве. Вакал у мяне выкладаў Яўген Віцінг — той самы, які вучыўся ў Італіі, яшчэ да рэвалюцыі быў салістам Марыінскага тэатра, а ў 1950-я вёў сольныя спевы ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Я — з трэцяга пакалення купалаўцаў. Таму добра ведаю, што самае галоўнае для артыста — слова. І тое, што ў ім схавана: яго сэнс, які трэба данесці. Так што і ў маналогу варта вылучыць стрыжань, акцэнтаваць яго, бо астатняе — "гарнір" да асноўнай стравы. І нельга ставіць кропкі, думка павінна працягвацца. Яшчэ вельмі важна знайсці неабходны тэмбр голасу — для кожнай ролі ён можа быць свой, — патрапіць тым тэмбрам і ў характар персанажа, і ў музыку спектакля. Усё гэта я імкнуся перадаць моладзі, з якой разам іграю. Цяпер у тэатр прыйшло шмат маладых артыстаў, а ў іх не было такіх педагогаў, як у мяне.

— Чаму ж тады вы самі ніколі не выкладалі?

— Выкладала сцэнічны рух, ды ўсяго адзін год, бо зразумела: усе мае студэнты будуць карыстацца маімі прыёмамі, што я знайшла для сябе. А кожнаму акцёру трэба адшукаць тыя, што зыходзяць з яго індывідуальнасці. Гэта пад сілу, бадай, толькі рэжысёру, а не артысту.

— Затое артысты, наколькі я ведаю, калі працуюць над роллю, абапіраюцца на ўласны жыццёвы вопыт, адшукваючы адпаведныя ўспаміны.

— Гэта дапамагае ва ўсіх сітуацыях. Памятаю, на трэцім курсе я рыхтавала маналог Кацярыны з апошняй дзеі "Навальніцы". Была закахана ў аднакурсніка, жудасна яго раўнавала — і тыя эмоцыі ўклала ў гераіню. Атрымалася!

— Атрымалася менавіта на сцэне. У жыцці вы ўзялі шлюб з зусім іншым чалавекам.

— Нас пазнаёміў Генадзь Аўсяннікаў. Гэта здарылася акурат пасля спектакля "Лявоніха на арбіце", у якім мы разам ігралі: я была дачкой галоўных герояў. Зірнула з грымёркі ў акенца, а там Аўсяннікаў з нейкім хлопцам на лаве. Убачыў мяне, крычыць: "Зін, давай уніз спусціся! Тут жаніх твой сядзіць". Пажартаваў, вядома, а назаўтра зранку ішоў тэніс на стадыёне "Дынама" — і мы там зноў сутыкнуліся. Гэта было каханне з першага погляду — і ў мяне, і ў яго. У тыя часы лічылася модным прагульвацца па праспекце: каля Галоўпаштамта шпацыравалі закаханыя, а ў раёне ГУМа — больш сталыя пары.

— Думаю, яшчэ вас вельмі зблізіў спорт, якому ваш муж Уладзімір Фартунатаў прысвяціў жыццё.

— Ён стаў заслужаным трэнерам па фехтаванні, кіраваў зборнай. Я вельмі пакутавала, што ў нас 10 гадоў не было дзяцей. Хацелі ўжо з дзіцячага дома кагосьці ўзяць, і тут я зацяжарыла. Цяпер у мяне не толькі дачка, але і трое ўнукаў. А ў тым выпадку, пэўна, адгукнулася цяжкае ваеннае маленства: здароўя яно не прыбавіла — якраз наадварот.

— Вам не было і трох гадоў, як пачалася вайна.

— Я нарадзілася непадалёк ад тагачаснага Ленінграда, у пасёлку Ульянаўка. Бацька загінуў на фронце. Ён быў марком, служыў на падводнай лодцы ў Кранштаце. У 1942-м, у час абароны Араніенбаумскага плацдарма, здзейсніў подзвіг Аляксандра Матросава, толькі нашмат раней за яго — закрыў целам варожы дзот. Там больш за 1700 абаронцаў тады загінула. А маці загадвала цэхам на швейнай фабрыцы "Бальшавічка". У вайну мы патрапілі ў працоўны лагер на месцы, дзе здабываўся торф. Немцы забралі нас на дачы, адвезлі ў лагер "Шталаг-340" непадалёк ад Даўгаўпілса (тады ён называўся Дзвінскам) і трымалі там два гады — 1942—1943-і. Памятаю, як нас вызвалілі. Пачалася бамбёжка, брыгадзір крычыць: "Разбягайцеся хутчэй, а то вас усіх зніштожаць!" І мы пабеглі. Я, старэйшая, рухалася за маці, ухапіўшы падол, каб не згубіцца. А мой брат быў у маці на руках. Панясе яго колькі, пасадзіць са мной, а сама выпраўляецца па клункі. І зноў — спачатку нас уперад, потым мы яе чакаем. Так і дабраліся да горада. А ён увесь разбураны, адны руіны. Але нам, як пагарэльцам, далі пакойчык. Пасля вайны не дазволілі вярнуцца ў Санкт-Пецярбург, бо ў нашых дакументах стаялі дзве нямецкія пячаткі. І мы засталіся ў Даўгаўпілсе. Там я і ў школу пайшла (акрамя звычайнай, скончыла яшчэ музычную), там у мяне і два захапленні з'явіліся — тэатр і спорт. Займалася ў тэатральнай студыі, ды і ў бабулі ў гасцях спектаклі ставіла — усе суседзі збягаліся паглядзець. Вучылася ў рускай школе, але і дагэтуль латышскую мову памятаю.

— А як беларускую засвоілі?

— За год, калі ў Мінску ў тэатральна-мастацкі паступіла. Праўда, некаторы час свае ролі я спачатку на рускую мову перакладала, каб паглыбіцца ў сэнс, а потым зноў на беларускую, каб ужо завучыць. Але цяпер па-беларуску не толькі гавару, але і разважаю. Можна лічыць, стала "карэннай беларускай".

— І карэнным купалаўцам! Невыпадкова ж для святкавання вашага юбілею была абрана нацыянальная класіка — "Вечар" па п'есе Аляксея Дударава.

— Ганна — мая першая роля простай вясковай жанчыны з вялікай, неабдымнай душой. Я вельмі доўга да такога вобраза ішла. Каб настроіцца, надзявала касцюм, уяўляючы сябе гэтай гераіняй. Падобную ролю нельга сыграць — яе трэба пражыць, знайсці для яе адпаведны характар. Цяпер у рэпертуары тэатра ідзе аднаўленая версія, а ставіў "Вечар" нябожчык Валерый Раеўскі. Было некалькі складаў, але наш — Кірычэнка, Падабед і я — ён любіў мацней. У іншых спектакль атрымліваўся больш побытавым, а ў нас закранаў праблематыку не толькі беларусаў, але і ўсяго свету. Неяк ігралі гэтую пастаноўку ў Фінляндыі, дык куратар дэлегацыі выйшла з залы ў слязах, уся заплаканая: маўляў, адносіны бацькоў і дзяцей — і наша праблема. А зараз бачу, як на "Вечар" прыводзяць школьнікаў. Яны спярша ўсе ў смартфонах — і раптам адрываюцца ад экранаў, пачынаюць пільна сачыць за дзеяй. І такая цішыня стаіць! Тое, што адбываецца ў спектаклі, — сапраўднае жыццё, хай і на сцэне.

— А ўласна вам што ў жыцці дапамагае?

— Любоў. І цікавасць. Мне цікавае ўсё: Батанічны сад, музей наш Мастацкі, кнігі — ды кожная травінка на шляху. Трэба ўмець усяму гэтаму радавацца, цаніць прыгажосць, што навокал, чалавечыя зносіны. Ад усяго, што робіш, атрымліваць задавальненне. Гэта і ёсць — любіць жыццё.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА і з архіва гераіні

УНП 100377901

1938

▸ Нарадзілася 3 лістапада ў мястэчку Ульянаўка Тосненскага раёна Ленінградскай вобласці.

1960

▸ Скончыла акцёрскі факультэт Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута па спецыяльнасці "Акцёр драматычнага тэатра" (курс народнага артыста БССР К. М. Саннікава). З 1 верасня працуе ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы.

У год прыходу ў Купалаўскі (1960)

1984

▸ За ролю Марысі ў радыёспектаклі "Хамуціус" паводле твора А. Куляшова ўшанавана Дзяржаўнай прэміяй Беларусі.

1988

▸ За добрасумленную шматгадовую працу ад імя Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР узнагароджана медалём "Ветэран працы".

1989

▸ За значны асабісты ўклад у развіццё беларускай культуры 17 ліпеня прысвоена ганаровае званне "Заслужаны артыст Беларускай ССР".

2013

▸ Стала народнай артысткай Беларусі.

У ролі... фотамадэлі (юбілейная фотасесія)

2023

▸ Усяго Зінаіда Пятроўна ўвасобіла больш за 75 вобразаў у тэатры і кіно.

цяпер

У бягучым рэпертуары выконвае ролі:

- Ганна ("Вечар" А. Дударава);
- Суседка ("Паўлінка" Я. Купалы);
- Цень Жаніцьбы ("Жаніцьба" М. Гогаля);
- Жанчына ў акенцы ("Чакана гучна і да болю блізка" М. Паніча);
- Пані Конці ("Час жыцця" О. Заградніка);
- Сіньёра Мантэкі ("Рамэа і Джульета" У. Шэкспіра).

Самае страшнае — нічога не адчуваць

Да XXIX Мінскага міжнароднага кінафестывалю "Лістапад", які сёлета пройдзе пад слоганам "Ствараем будучыню", — два тыдні. Адной з асноўных падзей форуму стане прэм'ера дэбютнай карціны Кірыла Халецкага "Кіношнікі". "К" сустрэлася з выканаўцам галоўнай ролі, Станіславам Пякарскім, каб даведацца, чаго чакаць ад фільма.

— Станіслаў, віншуем з заканчэннем здымак. Гэта ваш першы сумесны праект з Кірылам Халецкім? Як працавалася з рэжысёрам і камандай?

— Сапраўды, гэта наш з Кірылам дэбют у тандэме "рэжысёр — акцёр". Падчас здымак мы часта размаўлялі пра майго персанажа, разам дапрацоўвалі яго. Напэўна, Кірыл не чакаў, што будуць такія змены. Але гэта натуральна, таму што сцэнарый ствараецца на паперы, а калі героя ўвасабляе жывы чалавек, то ён прыўносіць нешта сваё ў вобраз. Што тычыцца каманды, то фільм стаў выклікам для ўсіх. Было шмат перашкод, з якімі раней не сутыкаліся. Але, нягледзячы на цяжкасці, абышлося без канфліктаў. Мы вучыліся на памылках, падтрымлівалі адзін аднаго. Здараліся невялікія зрывы праз нервы, бо на псіхалагічным стане адбіваўся жорсткі графік. Але гэта толькі ў асобныя моманты. Калі працоўны дзень заканчваўся, мы адпускалі стрэс і сыходзілі дадому ў добрым настроі. На фінальных этапах нават марылі, як будзем ствараць стужку "Кіношнікі-2".

— Чым запомніўся праект?

— Я ніколі не забуду, як на маёй галаве рабілі непранікальны кокан налакіраваных валасоў *(смяецца)*. А калі шчыра, то ў нас была цудоўная сцэна танца, якую здымалі ў павільёне "Беларусьфільма". Не забуду і яркія сцэны сноў майго персанажа, Колі, дзякуючы якім я быццам пражыў 10 розных жыццяў. Коля, як творчая асоба, часта непакоіцца пра сябе і кінамастацтва так, што хваляванні не адпускаюць яго нават у сне. Гэтыя эпізоды — самыя маляўнічыя, у іх задзейнічана шмат розных персанажаў, у тым ліку гістарычных.

— Што адчуваеце пасля заканчэння здымак?

— Да "Кіношнікаў" я рыхтаваўся з выкладчыкам па акцёрскім майстэрстве Ганнай Палупанавай, якая падзялілася вельмі цікавай думкай. Калі ў артыста галоўная роля, ён успрымае сябе як цэнтр сусвету. Але як толькі на фінальнай змене прагучыць "стоп", з'яўляецца пачуццё адзіноты. Цягам усяго праекта я трымаў гэтую думку ў галаве. І ў апошні дзень здымак пасля каманды рэжысёра я зразумеў, пра што была гаворка. Я бачыў, як усе кудысьці разыходзяцца: па справах, да родных, сяброў, каханых.

Вядома, у мяне багата знаёмых, але ў той момант я застаўся сам-насам з пякучай самотай і зразумеў: я больш не цэнтр. Безумоўна, усё трохі ўтрыравана, але гэтае пачуццё было настолькі моцным, што я анямеў. І тады згадаліся іншыя словы педагога: не трэба бегчы ад свайго стану, варта зафіксаваць гэты этап для сябе.

Я, праўда, люблю пражываць эмоцыі. Самае страшнае для мяне — нічога не адчуваць. Эмоцыі не заўсёды павінны быць станоўчымі, нават адмоўнымі трэба ўпівацца. Здарылася дрэннае — прапусці гэта праз сябе, бо яно і робіць цябе жывым.

— Ці змяніліся вашы адносіны да героя?

— Змяніўся я сам. Коля пакінуў на мне адбітак: я пачаў больш паглыбляцца ў сябе, больш рэфлексаваць у нейкія моманты. Падчас здымак усвядоміў, што мая энергія не бязмежная, і пачаў факусавацца канкрэтна на працэсе, берагчы рэсурсы па-за кадрам. Думаю, што гэтую рысу характару свайго персанажа — сур'ёзны погляд на жыццё — я пакіну.

— А як вы сталі акцёрам?

— Я прыйшоў у кіно са спорту — са зборнай Рэспублікі Беларусь па лёгкай атлетыцы. У маёй сям'і склалася дынастыя: усе лёгкаатлеты. Але ў пэўны момант у мяне здарылася стагнацыя ў выніках, і я зразумеў, што трэба нешта мяняць. Аднойчы з сябрам гулялі па Магілёве, убачылі аб'яву аб наборы ў тэатральную студыю "Факел" і проста зайшлі туды. З гэтага ўсё і пачалося. Гурток зрабіўся для мяне аддушынай, і я ўсё часцей задумваўся: а чаму б не стаць акцёрам, калі мне гэта падабаецца? Паехаў на курсы ў Мінск, потым у Маскву. Спрабаваў сябе ў масоўках, здымаўся ў рэкламах, набываў сувязі. І ўсё закруцілася.

— Ці можа акцёр годна выканаць ролю, каб вобраз не паўплываў на самога выканаўцу?

— Вядома. Гэта называецца прафесіяналізм. Я лічу, што сапраўдны майстар той, хто здольны не падключацца да героя цалкам і менавіта паказваць, а не перажываць эмоцыі персанажа. Уявіце, што трэба сыграць складаную сцэну, у якой памірае ваша дзіця. І здымаць будуць 15 дубляў. Калі вы ўсе 15 разоў перажываеце смерць дарагога чалавека ўсур'ёз, вы з'едзеце з глузду. Ды ў вас у прынцыпе не хопіць рэсурсу, каб столькі разоў прапусціць праз сябе ролю. Акцёрскае майстэрства заключаецца ў тым, каб адлюстраваць эмоцыю, не трацячы самога сябе.

— Які вобраз падаецца вам самым складаным?

— Напэўна, антаганіст, бо яны заўсёды розныя, унікальныя. Аднак я і Колю стараўся не рабіць занадта правільным: у яго праскокваюць адмоўныя рысы, уласцівыя ўсім людзям недахопы. Праз гэта персанаж становіцца больш цікавым, шматгранным.

— Як не выгараць у прафесіі?

— Эмацыйнае знясіленне можа прыйсці ў любы момант, таму трэба пераключацца на іншыя справы. Вельмі дапамагаюць блізкія людзі. Я прыехаў на гэтыя здымкі з Масквы, у мяне ў Мінску няма родных, але ёсць сябры. Таму, калі выпадаў вольны час, я прыязджаў да іх і адпачываў, дзякуючы гульням, фільмам, хорар-квэстам. Побач з выгараннем у прафесіі акцёра стаіць спустошэнне на здымачнай пляцоўцы ў межах адной сцэны. Такое часта здараецца, калі трэба паказаць моцную эмоцыю і робіцца некалькі дубляў. У такіх сур'ёзных сцэнах вельмі важна не патраціць сябе спачатку. У мяне быў вопыт, калі праз няведанне я ўрываўся ў першы дубль і выдаваў максімум дыяпазону. Пакуль даходзіла да буйнога плана, я проста выдыхаўся. Трэба памятаць, што акцёрства — быццам гонка, у якой трэба размяркоўваць сілы.

— Ваш персанаж у "Кіношніках" — малады рэжысёр. Не з'явілася жаданне змяніць амплуа?

— Не ў найбліжэйшы час. Цяпер няма такога творчага парыву. Я здымаў некалькі кароткіх метраў як аматар, але мне падабаецца быць у кадры самому. Так што пакіну рэжысуру таму, хто без яе не можа.

— Што вас натхняе?

— Людзі, гісторыі, фільмы, вельмі зараджаюць падарожжы. Назіраючы за рознымі асобамі, я заўважаю, наколькі наш свет цікавы. У ім столькі ўсяго неабсяжнага, чароўнага. Для мяне гэта бяздонны калодзеж натхнення.

Яўгенія ГАБЕЦ
Фота з архіва героя

5 парад акцёрам-пачаткоўцам ад Станіслава Пякарскага

1. Верце ў сябе і слухайце сваё сэрца.
2. Не бойцеся ўвайсці ў прафесію нестандартным шляхам: не заўсёды вы трапіце ў акцёры пасля школы і вас адразу знойдзе агент.
3. Будзьце камунікабельныя. У індустрыі кіно важная адукацыя, але не менш істотныя стасункі.
4. Прасоўвайце асабісты брэнд у сацыяльных сетках — гэта павялічвае шанцы, што кастынг-дырэктары звернуць на вас увагу.
5. Памятайце, што акцёрскі шлях — пастаянная вучоба. Шукайце веды ўсюды, дзе можаце да іх дацягнуцца. Акцёрства як спорт: калі кінуць трэніроўкі, форма сыдзе праз два-тры тыдні. Але ў акцёрстве няма мяжы магчымасцей, таму спасцігайце глыбіню сваёй душы, псіхаэмацыйнае цела.

Падчас здымак

Першы. Аж у трэцяй ступені

Днямі прыйшла добрая навіна: на I Міжнародным конкурсе маладых оперных выканаўцаў імя Ф. Шаляпіна ў Санкт-Пецярбургу — у творчым спаборніцтве паўдзельнічала 219 чалавек — першую прэмію атрымаў першакурснік Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Іосіф Нікіценка. І разам з узнагародай — шэраг вельмі прэстыжных запрашэнняў на некалькі міжнародных фестываляў.

— Першая прэмія, першы курс, конкурс таксама — першы. Атрымліваецца гэткая адзінка ў трэцяй ступені. Чым не містыка? У вашым жыцці бывалі нейкія неверагодныя здарэнні?

— Ды на гэтым конкурсе, напрыклад. Я вельмі хваляваўся, што нічога не атрымаецца: папярэдні адбор па дасланых запісах, далейшыя тры туры, вельмі вялікая колькасць удзельнікаў, усе добра падрыхтаваныя, з багатым вопытам. Прайшоў у другі тур — ужо добра, бо адсеў быў проста велізарны. Патрапіць у трэці — ці ж гэта магчыма? І раптам сасніў старшыню журы — Ільдара Абдразакава, уладальніка звання "Найлепшы бас свету" і безлічы іншых узнагарод. Ён сказаў мне: "Пройдзеш" — быццам блаславіў, і гэта надало мне веры ў сябе. А пасля ўзнагароджання маці падзялілася: ёй таксама Абдразакаў прысніўся і паведаміў, што прысудзіць мне першае месца.

— Думаю, тыя сны былі разумовым увасабленнем вашых жаданняў.

— Хіба падсвядомым, бо хваляваўся я да апошняга. Пасля трэцяга тура, у які патрапілі 12 фіналістаў, прыкінуў, што павінна быць бронза. І вось нясуць дыплом трэцяй ступені — аказалася, не мне. Адразу думка: усё прапала! Потым другое месца — таксама не мне. І раптам — першае! У гэта немагчыма было паверыць! А яшчэ Абдразакаў запрасіў мяне на свой VII Міжнародны музычны фестываль, які зладзяць у наступным годзе. Дзмітрый Удовін, мастацкі кіраўнік Маладзёжнай опернай праграмы Вялікага тэатра Расіі, — на XVII Зімовы міжнародны фестываль мастацтваў Юрыя Башмета ў Сочы. Дабрачынны фонд Аксаны Фёдаравай прапанаваў запісаць тры сольныя праграмы. Паклікалі і на вучобу ў пецярбургскую кансерваторыю, і на працу ў Вялікі тэатр Расіі.

— Значыць, беларускі спявак хутка стане расійскім?

— Я збіраюся ў армію пайсці — служыць у Акадэмічным ансамблі песні і танца Узброеных Сіл Беларусі. Там працягну займацца сваёй справай — спяваць. Магчыма, паўдзельнічаю ў фестывалях і конкурсах. Яны многа даюць для музычнага развіцця, становяцца чарговай прыступкай у прафесійным удасканаленні, падштурхоўваюць да новых, больш высокіх мэт. А сваю краіну пакідаць не збіраюся. Я вельмі люблю Беларусь! Шмат даводзілася ездзіць — па тых жа конкурсах.

— Так, літаральна напярэдадні, у пачатку кастрычніка, вы атрымалі бронзу на XVII Маладзёжных Дэльфійскіх гульнях краін СНД у Бішкеку — сталіцы Кыргызстана.

— Куды ні завітаю — усё там чужое. Безумоўна, цікава пазнаёміцца з іншымі дзяржавамі, культурамі, але ж свой край — найлепшы. Дома і пяецца лепш! Нават у Расіі адчуваю сябе не так. І моўнага бар'ера няма, і гэта найбліжэйшая, здавалася б, суседняя краіна, з якой нас многа звязвае. А розніца ёсць. На конкурсе Шаляпіна былі створаны ідэальныя ўмовы: нас пасялілі ў гатэль, вельмі клапаціліся. Усяго тыдзень, а па радзіме засумаваў. У маім рэпертуары шмат беларускай музыкі — найперш песні Ігара Лучанка, рамансы Рыгора Пукста, народныя песні. У тым жа Бішкеку выконваў беларускую народную "А ў полі вярба". У Беларусі ўсё роднае, сваё! Аж на генным узроўні. І тут добрая музычная адукацыя.

— Сапраўды, наша краіна ганарыцца трохступеннай адукацыяй, якая дазваляе развіваць музычныя здольнасці з самага дзяцінства: школа мастацтваў — каледж — Акадэмія музыкі ці Універсітэт культуры і мастацтваў. Хто з педагогаў паўплываў на вас больш за іншых?

— Лічу сваім настаўнікам Георгія Юрэвіча. У Акадэмію музыкі я паступіў нядаўна — у клас заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь прафесара Міхаіла Зданевіча. За яго плячыма — багатая сольная практыка ў нашым Вялікім тэатры, амаль 30-гадовае кіраўніцтва кафедрай опернай падрыхтоўкі, уласныя пастаноўкі ў опернай студыі. Але я толькі-толькі прыйшоў да Міхаіла Аляксандравіча, і мая цяперашняя перамога — плён ранейшай вучобы.

У час узнагароджвання: Ільдар Абдразакаў, Іосіф Нікіценка

"Куды ні завітаю — усё там чужое. Безумоўна, цікава пазнаёміцца з іншымі дзяржавамі, культурамі, але ж свой край — найлепшы. Дома і пяецца лепш!"

— Той, што пачалася ў дзіцячай музычнай школе Касцюковічаў? Вы там нарадзіліся, з пэўнага часу шмат выступалі на розных пляцоўках, атрымалі званне "Залаты голас Касцюкоўшчыны".

— Я вучыўся па класе духавых, іграў на барытоне, у тым ліку ў народным духавым аркестры. Але музычную школу не скончыў, бо спяваць мне падабалася куды больш. І маляваць. Я і цяпер захапляюся жывапісам, люблю ў Касцюковічах рыбачыць, але вольнага часу ўсё менш. А вакальнай падрыхтоўкай я цалкам абавязаны Георгію Іларыёнавічу.

— Я так разумею, менавіта з той прычыны вы паступалі не ў Магілёўскі каледж мастацтваў, куды бліжэйшы да дому, а ў Маладзечанскі музычны імя Агінскага.

— Так, я абіраў не навучальную ўстанову, а педагога. Ён літаральна па адной нотцы выбудоўваў мне дыяпазон. Памятаю, колькі радасці было, калі я навучыўся браць вярхі.

— Мяркуючы па выкладзеных у інтэрнэт запісах, раней вы імкнуліся да ніжніх нот, ледзь не да басовых.

— Я лічыў сябе барытонам, арыентаваўся на Дзмітрыя Хварастоўскага, Мусліма Магамаева, пераймаў манеру кожнага з іх. А Юрэвіч паслухаў і сказаў: "Ты ж тэнар! Будзем вярхі развіваць". Я давяраю выкладчыку, карыстаюся яго парадамі, што тычацца не толькі вакалу, але і розных жыццёвых абставін.

Увогуле, каледж у Маладзечне даў мне вельмі многа. Менавіта там я ўпершыню заспяваў з аркестрам — і са студэнцкім сімфанічным, якім кіруе Рыгор Сарока, і асабліва з аркестрам рускіх народных інструментаў на чале з Тамарай Бяльковай. Падчас вучобы я ўпершыню выканаў партыю Ленскага з оперы "Яўген Анегін" Чайкоўскага, атрымаў Гран-пры XII Рэспубліканскага творчага радыёконкурсу "Маладыя таленты Беларусі".

— Перадсмяротную арыю Ленскага вы спявалі і цяпер, у трэцім туры і на заключным гала-канцэрце, у Вялікай зале Санкт-Пецярбургскай філармоніі з аркестрам "Паўночная сімфонія" пад кіраўніцтвам Фабіа Мастранджэла. Я бачыла той запіс — ён не падобны на конкурсны. Па эмацыйнай выразнасці, глыбіні разумення, пранікнення ў псіхалагічны стан героя ў вас атрымаўся сапраўдны фрагмент нават не проста оперы, а добра зрэжысіраванага опернага спектакля.

— Дзякуй, але яшчэ раз паўтару: без майго выкладчыка Юрэвіча нічога гэтага не было б. Адукацыя, як і ўсё ў мастацтве, — гэта найперш выбітныя асобы.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота з архіва героя

Дарыць людзям свята

Гэту мэту ставіць Ашмянскі раённы цэнтр культуры — і творчае жыццё ва ўстановах віруе: рэалізуюцца традыцыйныя праекты, здзяйсняюцца планы, зараджаюцца новыя задумы.

ПОЎНЫ КОШЫК ІДЭЙ

Бягучы год для тутэйшых клубных устаноў стаў багатым на яскравыя падзеі. Гэта і вядомыя далёка за межамі раёна брэндавыя мерапрыемствы — народна-фальклорныя ды тэатралізаваныя святы: “Загаўліны” ў аграгарадку Кальчуны, “Сёмуха” ў вёсцы Гродзі, “Камень-цудатворца” ў аг. Навасёлкі, “Кветкавая феерыя” ў Кракаўцы, “Радасць сустрэчы пад покрывам святога Ільі” ў Міхайлаўшчыне, “Сталёвая магістраль” у аг. Станцыя Ашмяны, “Граўжышкоўскі мядовы кірмаш” у аг. Граўжышкі, “Вясковы сыравар” у Жупранах, “Поўны кошык” ў Крэйванцах. Традыцыйна прываблівають шматлікіх гасцей “Гальшанскі кірмаш” і вечар містэрыі рэгіянальнага фестывалю “Гальшанскі замак”.

Развіваюцца і новыя ініцыятывы. Так, у рамках этнаграфічнага праекта “Гутарка” арганізаваныя экспедыцыі па зборы фальклорных матэрыялаў рэгіёна. Цікава прайшоў тыдзень традыцыйнай культуры “Ад даўніны да нашых дзён”. Займальнымі сталі здымкі праграмы “Беларуская кухня” тэлеканала “Беларусь-3”, дзе мясцовая гаспадыня Тэрэса Прыбыльская падзялілася рэцэптамі прыгатавання страў народнай кухні.

РАЎНЕННЕ — НА НАЙЛЕПШЫХ

Энергія культработнікаў не ведае спакою ні ў будні, ні ў святы — заўсёды з усмешкай, добрым словам і шчырай песняй сустракаюць яны сваіх гледачоў і слухачоў.

Найлепшыя калектывы і прадстаўнікі раённага цэнтра культуры ўдзельнічалі ў розных творчых спаборніцтвах. Так, дыпламантам I ступені абласнога фестывалю рэгіянальнага фальклору “Панямоння жыццятворныя крыніцы” стаў фальклорна-інструментальны ансамбль аддзела культуры і вольнага часу аг. Граўжышкі. Дыпломам “За духоўнае і патрыятычнае выхаванне моладзі, прапаганду песні” ўзнагароджаны хор ветэранаў раённага цэнтра культуры па выніках XXVII Абласнога фестывалю народнай творчасці ветэранскіх калектываў “Не старэюць душой ветэраны”.

Майстры аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры паказалі сябе ў конкурсе ганчароў “Гліна спявае” на міжнародным пленэры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, Рэспубліканскім свяце “Купалле”, абласной выставе-конкурсе дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Велікодны падарунак”, рэгіянальным свяце народнай творчасці “Ад прадзіва да ткацтва” ды іншых.

Удзельнікі народнага тэатра танца і песні “Імпульс” паспяхова выступілі з канцэртнай праграмай на II Гульнях краін СНД.

Годна паказалі сябе і аматарскія аб’яднанні клубных устаноў вёскі Гродзі, аграгарадка Станцыя Ашмяны і Кальчун у абласным аглядзе-конкурсе аматарскіх аб’яднанняў “Святло захаплення”.

КУЗНЯ КАДРАЎ

Жыццё ў Ашмянскай дзіцячай школе мастацтваў таксама віруе. Сёння тут на музычным, мастацкім, тэатральным, харэаграфічным і мастацка-эстэтычным аддзяленнях навучаюцца 517 дзяцей.

За мінулы год больш за 180 адораных навучэнцаў сталі лаўрэатамі конкурсаў рознага ўзроўню, 15 з іх прадставілі раён на абласных спаборніцтвах. Новым і асабліва цікавым аказаўся ўдзел у рэспубліканскім патрыятычным конкурсе малюнкаў “Хатынь вачыма дзяцей”, па выніках якога ўдзельнікі былі ўзнагароджаныя граматамі і запрошаныя на ўрачыстыя мерапрыемствы ў Гродна і Мінск.

Настаўнікі ва ўсім падаюць прыклад вучням: традыцыйным стала правядзенне да 9 Мая і да Дня Незалежнасці фестываляў вулічнай музыкі, справаздачных канцэртаў, перасоўных тэматычных выстаў. На працягу года для хлопчыкаў і дзяўчынак ладзяцца дыскатэкі, ранішнікі, чаяванні, Дні адкрытых дзвярэй. Дзякуючы ініцыятыве прафсаюзнага камітэта педагагічны калектыў выязджае на экскурсіі, у тым ліку ў Гальшанскі замак. А маладыя спецыялісты — на турыстычны злёт і абласны фестываль “Творчыя моладзевыя лабараторыі Project Art”.

Чатырнаццаць вопытных педагогаў фарміруюць у вучняў пачуццё прыгожага, любоў да мастацтва. Творчы тандэм, заснаваны на карпатлівай працы, дае плён. За мінулы год юныя музыканты і мастакі атрымалі перамогу ў 39 фестывалях-конкурсах, алімпіядах, заваявалі 90 дыпломаў рознага ўзроўню. Галоўным гонарам установы з’яўляюцца 126 юных талентаў. Настаўнікі выкарыстоўваюць сучасныя падыходы, смела асвойваюць новыя тэхналогіі. І не дзіва, што школа дынамічна развіваецца і паспяхова вырашае задачы — дае магчымасць дзецям знаёміцца з рознымі відамі мастацтва і рыхтуе кадры для далейшай працы ў сферы культуры.

КНІЖНЫЯ СКАРБНІЦЫ

Музычная і мастацкая адоранасці дадзены, на жаль, не ўсім. Аднак шматгранная культура дазваляе кожнаму дакрануцца да яе. У займальны свет кнігі клічуць іх верныя захавальнікі.

Бібліятэчным абслугоўваннем насельніцтва Ашмянскага раёна займаюцца 14 публічных бібліятэк — фонд складае 243,9 тысяч адзінак: калі чытаць па пяць кніг у месяц, то за 50 гадоў атрымаецца адолець крыху болей за працэнт. Паслугамі ўстаноў карыстаюцца каля 12 тысяч чалавек, прычым колькасць віртуальных наведванняў расце і склала ўжо 15,5 тыс. У аддаленыя вёскі рэгулярна наведваецца “кніга на колах” — бібліёбус карыстаецца попытам у вяскоўцаў.

Пры бібліятэках працуюць 17 аматарскіх аб’яднанняў, якія прапануюць забавы і дзецям, і дарослым. Работа па папулярызацыі кнігі і чытання знайшла сваё адлюстраванне ў арганізацыі масавых мерапрыемстваў. З пачатку года іх праведзена 668.

У Год міру і стварэння асаблівая ўвага надаецца патрыятычнаму выхаванню. Чытачоў прывабілі раённы бібліятэчны марафон “Беларусь пачынаецца тут і цяпер”, цыкл мерапрыемстваў “Паклонімся вялікім тым гадам”, франтавы лекторый, прэзентацыя экспазіцыі “Генацыд — наша памяць і боль”. Запомніліся жыхарам горада і фестываль дзіцячага чытання “Кніжны БУМ”, і бібліяноч “Паляўнічыя за кнігамі”.

Установы таксама рэалізуюць шэраг іншых актуальных праграм: “Бібліятэка: прававая абарона і прававая асвета насельніцтва”, “Праз праваслаўе да вытокаў духоўнасці”, “Ашмяншчына літаратурная”, “PRO-чытаў”.

І на сайце бібліятэкі прадстаўлены ўласныя анлайн-праекты. Да прыкладу, на працягу года сярод дзяцей праходзіць анлайн-конкурс чытальнікаў “Мы дзеці твае, Беларусь”.

Творчая праца работнікаў прыносіць свой плён: па выніках мінулага года Гальшанская бібліятэка стала пераможцам рэспубліканскага конкурсу “Бібліятэка — цэнтр духоўнай асветы і выхавання”.

Паводле матэрыялаў Ашмянскага РЦК
Фота з архіва цэнтра

Творчая вечарына “Акварэль” адбудзецца ў Віцебскай абласной філармоніі 5 лістапада.

Пачуцці за грошы — каму і навошта?

Прэм’ерны спектакль “Плачу за любоў” у Новым драматычным тэатры карыстаецца неверагодным поспехам: усе квіткі раскуплены, па замове калектываў прызначаюцца дадатковыя паказы. “Вінаватая” назва? Ці ёсць штосьці яшчэ — са спасылкай на сарафаннае радыё?

У назве менавіта любоў, а не каханне. Адзінокі “раганосец”, як ён сам сябе называе, хоча мець любоў жонкі, з якой раздзяліў у шлюбе ўжо 20 гадоў, падрослай дачкі, што вучыцца на юрыста, і аўдавелага сябра-антыквара, які жыве непадалёк і гатовы завітаць па першым клічы. Але ўсё тое — быццам бы. Бо герой знаходзіць выканаўцаў гэтых роляў для “хатняга тэатра”, шчодра плаціць за працу — і пачынаюцца неспадзяванкі, зблытанасць рэальнасці і акцёрскай ігры.

П’еса “Месье Амількар, або Чалавек, які плаціць” французскага драматурга XX ст. Іва Жаміяка ў рэжысёрскім прачытанні мастацкага кіраўніка тэатра Сяргея Кулікоўскага застаецца амаль некранутай, без аніякіх прынцыповых пераробак, хіба з некаторымі касметычнымі скарачэннямі і перастаноўкай некалькіх фраз у фінале. Сцэнаграфія Лідзіі Малашэнка максімальна простая: крэслы, рухомыя столікі на колцах, мэблю перасоўваюць самі артысты. Не атрымлівае павароту на 180 градусаў і цэнтральная тэма, актуальная як ніколі, — важнасць жывых чалавечых стасункаў, шчырай эмпатыі і любові сярод родных і блізкіх, значнасць сям’і і сямейных каштоўнасцей, паразумення і сяброўства. Але ж як перайначваецца матывацыя адных і тых жа ўчынкаў герояў у розных акцёрскіх складах! Атрымліваюцца два цалкам непадобныя спектаклі: змяняюцца і характары персанажаў, і сам жанр пастаноўкі.

Амількар Эдуарда Вайніловіча — бухгалтар не толькі па прафесіі, але і па жыцці. У яго ўсё разлічана, раскладзена па палічках на стагоддзе наперад. І сям’я патрэбная персанажу найперш для статусу і задавальнення эга: маўляў, вось як усе мяне любяць. Ды раптам становіцца зразумела, што прычына Амількаравых жыццёвых катаклізмаў — у ім самім, у яго няўменні любіць, аддаваць блізкім не грошы, а часцінку сябе. Спозненае ўсведамленне гэтага прыводзіць да трагічнага канца — яшчэ больш яркага ўнутры камедыі, часам нават эксцэнтрычнай, у бок якой схіляецца ўвесь спектакль, за выключэннем нечаканага фіналу.

Элеанора Міланы Івановай — даволі пасрэдная “прымадонна”, якая прыдумляе сабе магчымую галівудскую кар’еру і прымае прапанову Амількара найперш праз грошы. Шчырыя пачуцці да мужчыны ўзнікаюць у яе далёка не адразу, хіба ў канцы аповеду. Цікава, што ў некаторых сцэнах у артысткі адчувальна выяўляюцца інтанацыі Надзеі Анцыповіч, якая іграе гэтую ролю ў іншым складзе, але глыбінны сэнс аднолькавых фраз значна адрозніваецца.

Герой Аляксандра Даманцэвіча — небарака, няўдалы малады мастак Машу. Адоранасць прачынаецца ў ім пад уздзеяннем Элеаноры, у якую ён, нават не ўсведамляючы гэтага, насамрэч закаханы. Таму персанаж і сыходзіць з “праекта” такім затарможаным, змярцвелым.

Пры іншым акцёрскім складзе — усё інакш. Васіль Ніцко ў ролі Машу — наадварот, папраўдзе таленавіты майстар, сталы і мудры чалавек. Намаляваўшы партрэт Элеаноры, ён транслюе Амількару: як ты можаш не закахацца ў яе?! Маўляў, калі не бачыш вартасцей гэтай жанчыны ў жыцці, заўваж іх хаця б на карціне.

Надзея Анцыповіч выяўляе Элеанору вельмі здольнай і на самай справе запатрабаванай артысткай. Тое, што яна распавядае пра Галівуд і мноства кантрактаў, — праўда, а не мары. Але гераіня настолькі прагне кахання, што кідае ўсё дзеля сям’і. Ці ж можа персанаж у гэтым прызнацца? Аніколі. Вось і сыпле іроніяй у канцы першай дзеі. Для Элеаноры тое момант гульні, спаборніцтва, хто каго, прычым са схаванай надзеяй, што гумар будзе ацэнены па заслугах.

Амількар Арцёма Пінчука — хай і бухгалтар, але ж творчы, вынаходлівы, імпульсіўны чалавек. Маючы драматычны вопыт сямейных стасункаў, герой баіцца перажыць яго нанова, баіцца зноў быць падманутым — і таму намаганнямі волі вымушае сябе не верыць у шчырасць.

Пры такім складзе атрымліваецца не столькі “авантурная камедыя”, як пазначана ў афішах, а ў найлепшым сэнсе слова меладрама — з акцэнтам на частцы “драма”. Цікава было сачыць і як змянялася Віржынія Настассі Аляксеевай у залежнасці ад партнёраў па сцэне. У адным выпадку гэта эксцэнтрычная асоба, што не ведае меж, у другім — больш сцішаная, разважлівая. Тое ж тычыцца і маці Элеаноры: Наталля Капітонава ў гэтай ролі псіхалагічна танчэйшая, Таццяна Булгакава імкнецца да камічнай эксцэнтрыкі.

Лёгкасць спектаклю забяспечвае падабраная рэжысёрам музыка — песні ў выкананні французскай спявачкі Мары Лафарэ. Але тая бесклапотнасць падманная: пастаноўка выклікае роздум пра чалавечыя зносіны, сапраўдныя і не вельмі. Ці можна за грошы прыдбаць любоў? Адказ відавочны. Але ж як шмат у тым пачуцці не толькі гучных інтанацый, але і амаль нячутных абертонаў! Камедыя “Плачу за любоў” — менавіта пра гэта.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Руслана АНАНЬЕВА

Падарунак для маладых талентаў

Так адмыслоўцы называюць Міжнародны конкурс юных выканаўцаў эстраднай песні “Халі-хало”. Чарговае творчае спаборніцтва разгорнецца 3—4 лістапада ў Наваполацку.

Конкурс праводзіцца з 1994 года ў мэтах падтрымкі юных талентаў, развіцця іх здольнасцей, папулярызацыі найлепшых узораў эстраднай песні. Сярод задач — стварэнне адзінай культурнай прасторы Беларусі з блізкім і далёкім замежжам, умацаванне дружбы і ўзаемаразумення паміж прадстаўнікамі маладога пакалення з розных краін, абмен ідэямі і наладжванне супрацоўніцтва па выяўленні новых імёнаў.

За 19 гадоў існавання конкурсу яго ўдзельнікамі стала больш за тысячу выканаўцаў — прадстаўнікоў 10 краін. “Халі-хало” ганарыцца сваімі пераможцамі, у ліку якіх паспяховыя маладыя беларускія артысты Ганна Трубяцкая, Мікіта Бялько, Валерыя Грыбусава.

Сёлета ў аргкамітэт паступіла 126 заявак з розных гарадоў Беларусі, Расіі, Грузіі, Арменіі. Прафесійнае журы адабрала 45 юных творцаў ад 8 да 16 гадоў.

На працягу некалькіх сезонаў старшынёй журы з’яўляецца Ірына Дарафеева, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь, дацэнт кафедры мастацтва эстрады Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. У складзе кампетэнтнай камісіі — прадстаўнікі вакальных школ і педагогі з Беларусі, Расіі, Грузіі, Арменіі.

Арганізацыйны камітэт падрыхтаваў для пераможцаў конкурсу каштоўныя падарункі і сувеніры. Усіх удзельнікаў парадуе і майстар-клас ад члена журы Алены Пінджаян — заснавальніка і мастацкага кіраўніка тэатра-студыі “Непаседы” (Расія).

Больш культурных навін — у нашым Telegram-канале @kultinfa.

Педагогі калектыву "Арэна" Сяргей і Ганна Кузняцовы

Быць цыркавымі — пакліканне

Цэнтр цыркавога мастацтва "Арэна" ў Мазыры — адзіны ў нашай краіне спецыялізаваны клуб. У пачатку 2000-х прафесійныя артысты цырка, муж і жонка Барыс і Марыя Кузняцовы, адкрылі ў горадзе на Прыпяці студыю, у якой сталі вучыць хлопчыкаў і дзяўчынак свайму мастацтву. Так адмыслоўцы заклалі падмурак беларускага дзіцячага цырка і ператварылі куточак Палесся ў "месца сілы" артыстаў-пачаткоўцаў. Спярша клуб трымаўся на энтузіязме кіраўнікоў, выхаванцаў і іх бацькоў. Сёння заслужаны аматарскі калектыў "Арэна" — брэнд не толькі Мазыра, Гомельшчыны, але і ўсёй Беларусі.

ЯК ПАЧЫНАЛАСЯ ГІСТОРЫЯ

Для мастацкага кіраўніка "Арэны" Марыі Мікалаеўны Кузняцовай Мазыр — родны горад. Яе муж Барыс Рыгоравіч, рэжысёр-пастаноўшчык, вырас у Данецкай вобласці. Раней яны разам выступалі, аб'ездзілі палову Зямлі. У скарбонцы пары — самая высокая ў свеце цыркавога мастацтва ўзнагарода. Гэта прыз "Залаты арол" за найлепшае шоу (Ласвегас, ЗША). Доўгі час сям'я нават жыла ў Амерыцы, аднак даўняй мары сужэнцаў пра дзіцячую студыю наканавана было спраўдзіцца менавіта на Палессі. Зрабіць прафесію сапраўднай "цыркавытворчасцю" сям'я задумала адразу пасля вяселля. На тое, каб разумець і правільна пабудаваць гэты механізм, спатрэбілася некалькі гадоў. Досвед выступленняў у цыркавых праграмах на найлепшых манежах Беларусі дыя краін блізкага і далёкага замежжа сур'ёзна дапамог кіраўнікам калектыву.

У першы год пасля заснавання "Арэна" паўдзельнічала ў тэлевізійным праекце "Спявай, душа". Крыху пазней адбыўся дэбютны сольны канцэрт. З часам у цэнтра значна павялічылася колькасць жанраў: акрабатыка, эквілібрыстыка, гімнастыка, жангліраванне і арыгінальны жанр. Трукі змяняліся, станавіліся больш складанымі. У нумарах з'явіліся дакладна адпрацаваныя ідэйныя і сюжэтныя лініі. Пільную ўвагу Барыс і Марыя Кузняцовы надавалі сцэнічным касцюмам выхаванцаў, музычнаму суправаджэнню і тэатралізацыі цыркавых праграм.

З ПАЛЕССЯ — У ВЯЛІКІ СВЕТ

Спачатку адзінай рэкламай цэнтра было сарафаннае радыё. З гадамі папулярнасць стала расці. Ужо ў 2007-м калектыў "Арэна" ўпершыню адправіўся пакараць міжнародныя пляцоўкі. Сёння ўстанова на чале з Кузняцовымі — унікальная для Беларусі.

Прадстаўнікі калектыву заваявалі ўжо звыш 60 узнагарод. Мазырскія творцы — уладальнікі Гран-пры і спецыяльных прызоў, чэмпіёны, медалісты, дыпламанты размаітых конкурсаў.

За час існавання "Арэны" хлопцы і дзяўчаты з Палесся паўдзельнічалі ў фестывалях цыркавога мастацтва ў Італіі, Кітаі, Расіі, Германіі, Украіне, Казахстане, Ізраілі, Літве, Латвіі... У кампліментах беларускім паветраным гімнастам рассыпалася сама прынцэса Манака — Стэфанія. У 2017-м упершыню для нашай краіны на V Міжнародным юнацкім цыркавым фестывалі "Новае пакаленне" ў Монтэ-Карла мазыране атрымалі тры спецыяльныя прызы. Праз год артысты пацвердзілі перамогу — удастоіліся "Сярэбранага юніёра", самай высокай узнагароды за ўсю гісторыю цырка ў Беларусі, а на творчым форуме European Youth Circus у Германіі былі адзначаны бронзавым медалём. Пасля ў горадзе Ухань (Кітайская Народная Рэспубліка) на прэстыжным Міжнародным фестывалі акрабатычнага мастацтва выхаванец Кузняцовых, эквілібрыст Максім Бабёр, таксама атрымаў "бронзу". У выступленні ён выкарыстаў восем шпулек, віртуозна ўтрымліваў раўнавагу. Яшчэ адно знакавае дасягненне ў скарбонцы цэнтра — Гран-пры Міжнароднага фестывалю CIRCUBA (2017) у Кубе.

За шматгадовую плённую працу, значны асабісты ўклад у развіццё цыркавога мастацтва, высокія прафесійныя дасягненні Барыс і Марыя Кузняцовы ўзнагароджаны медалямі Францыска Скарыны, нагруднымі знакамі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Гэта — вынік паспяховай работы ўсяго калектыву.

НОСЬБІТЫ СТАРАЖЫТНЫХ ВЕДАЎ

Дзень за днём у Мазыры, на вуліцы Інтэрнацыянальнай, бурліць сапраўднае жыццё артыстаў. Тут нараджаюцца і адточваюцца да беззаганнасці шэдэўры.

У рэпертуары юных творцаў — некалькі дзясяткаў разнажанравых нумароў. Палітра вельмі яркая. Назіраючы за трэніроўкамі і ацэньваючы выступленні, многія дзівяцца, што не дарослыя прафесіяналы, а дзеці выконваюць такія неверагодна складаныя трукі. Але гэта рэальнасць. Узрост удзельнікаў калектыву — ад 6 да 20 гадоў. Дарэчы, сябе артысты называюць толькі "цыркавыя", а на "цыркачоў" могуць нават пакрыўдзіцца. Цыркавыя — асабліва "нацыянальнасць". Яны — носьбіты старажытных ведаў, перанятых за гады трэніровак.

Каб уступіць у шэрагі "арэнаўцаў", неабходна дачакацца запрашэння. Чарга расцягваецца на год-паўтара. Хлопчыкаў і дзяўчынак, якія жадаюць бясплатна вучыцца цыркавому мастацтву, у Мазыры вельмі шмат. Усе патэнцыйныя выхаванцы праходзяць адбор, бо, каб стаць артыстам цырка, трэба мець пэўны ўзровень фізічнай падрыхтоўкі, сілу, цягавітасць і маральную ўстойлівасць. Але нават гэта не галоўнае. У дзіцяці павінна быць жаданне займацца, пераадольваць цяжкасці, магчымыя няўдачы і рухацца наперад.

АДНА МАРА НА ЎСІХ

Год таму "Арэна" панесла страту. Не стала Марыі Мікалаеўны. Сёння яе муж працягвае супольную справу, у цэнтры выкладаюць і сын з нявесткай — Сяргей і Ганна Кузняцовы. Яны часта задумваюцца пра будучыню выхаванцаў. Мара агульная — стварыць прафесійны цыркавы калектыў. Усім артыстам хацелася б, каб і пляцовак для выступленняў станавілася больш. Тады досвед і рост не прымусяць сябе чакаць.

Кузняцовы прызнаюцца: некаторыя бацькі лічаць, што цыркавы артыст — не прафесія, забіраюць хлопцаў і дзяўчат са студыі, прымушаюць асвойваць іншую спецыяльнасць. Хаця гэтыя дзеці — вельмі здольныя. Яны пераможцы міжнародных конкурсаў, лаўрэаты і стыпендыяты фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. Велізарнае жаданне Кузняцовых — каб такія бацькі зразумелі: быць цыркавым — пакліканне, якое можа стаць справай усяго жыцця!

Ганна САКАЛОВА
Фота з архіва калектыву

Хіба гэта не цуд?

Маці везла яе на санчках па заснежанай Вязьме, а дзяўчынка гучна спявала "В лесу родилась ёлочка...". Мінакі ўсміхаліся: "Артыстка расце". На той момант нашай гераіні было два з паловай гады.

Вакалу яна вучылася пад "акампанемент" пласцінак. "Я ставіла любімую — і спявала так, што ўсе суседзі чулі, — усміхаецца Алена Давыдзенкава, кіраўнік народнага ансамбля народнай песні «Вечарынка». — На школьную сцэну ў якасці спявачкі выйшла ў восьмым класе. У нас стварылі вакальна-інструментальны ансамбль, і кожны клас павінен быў прадставіць кампазіцыю пад жывую музыку. Я выканала песню Лілліі Івановай — і атрымала Гран-пры школьнага конкурсу. Назаўтра прачнулася знакамітай".

Цікавілася наша гераіня і танцамі. Наведвала харэаграфічны гурток, планавала ісці ў Гродзенскае культасветвучылішча на харэаграфа. Тады сям'я ўжо пераехала ў Беларусь, на радзіму мамы — у Слуцкі раён.

На ўступных экзаменах камісія адзначыла менавіта вакальныя дадзеныя дзяўчыны і парэкамендавала вучыцца на харавога дырыжора. Алена не супраціўлялася — і пазней ні разу не пашкадавала, што не стала танцоркай. Культасветвучылішча скончыла з чырвоным дыпломам.

У 1987-м па размеркаванні трапіла на Смаргоншчыну. "Ехала на адпрацоўку. І ўявіць не магла, што Жодзішкі стануць другой радзімай. Я апынулася ў такім творчым асяроддзі, што лепшага шукаць не захацела. На той час у клубе працавала Людміла Кісялёва — чалавек, апантаны фальклорам. Яна і мне прывіла любоў да народных танцаў, песень, музыкі. Да таго ж мне выдзелілі аднапакаёвую кватэру, вырашылі маё жыллёвае пытанне".

У Жодзішкаўскім ДК Алена Давыдзенкава кіруе дзіцячым аматарскім аб'яднаннем "Вясёлыя ноткі", гурткамі "Вакальныя спевы" (для дзяцей) і "Акорд" (эстрадныя спевы для дарослых). Але яе галоўнае тварэнне — ансамбль "Вечарынка", заснаваны чвэрць веку таму.

Зарадзілася "Вечарынка" восенню 1998-га як фальклорны ансамбль песні і танца, і ўжо праз пяць гадоў калектыву было прысвоена званне народнага. Дзейнасць "Вечарынкі" — лагічны працяг і развіццё культурных традыцый, што сфарміраваліся на Смаргоншчыне за стагоддзі. Унікальная музычна-абрадавая спадчына ўвасобілася ў шматлікіх канцэртных праграмах калектыву, у рэпертуары якога больш за сотню песень — беларускіх народных ды аўтарскіх. Візітоўка ансамбля — "Жодзішкаўская полька".

— Быў час, калі "Вечарынка" налічвала два дзясяткі ўдзельнікаў: спявалі і танцавалі медыкі, работнікі калгаса, лясгаса... — успамінае Алена Вікторааўна. — Цяпер, на жаль, людзі не так ахвотна займаюцца мастацкай самадзейнасцю. У ансамблі дзевяць чалавек, практычна ўсе — са сферы культуры. Толькі акампаніятар Андрэй Гіль — механізатар філіяла "Жодзішкі", але і гэты чалавек — не меншы прафесіянал, чым астатнія. Мае талент ад Бога. Мама Андрэя — прафесійны музыкант, і браты ў свой час былі ўдзельнікамі "Вечарынкі". Жонка Святлана — настаўніца музыкі — і цяпер у калектыве.

— Дарэчы, калісьці Кацярына Дудзінская, якая стаяла ля вытокаў гурта, а зараз таксама кіруе "Вечарынкай", з будучым мужам пазнаёмілася ў ансамблі. Такіх прыкладаў шмат. "Вечарынка" для нас як сям'я, — дапаўняе Алена Махнач, якая далучылася да гурта ў 2001-м.

— Тое, што Алена Вікторааўна і дагэтуль узначальвае калектыў, — подзвіг, — ацэньвае працу калегі Кацярына Дудзінская. — У "Вечарынцы" з'яўляюцца новыя людзі, і да кожнага Алена Вікторааўна знаходзіць падыход. Хіба гэта не цуд, што на рэпетыцыі ў Жодзішкі прыязджае з Сасноўкі Каця Варанішча, са Смаргоні — Валерыя Бачкарова?! Ганарымся, што ў нас у складзе ёсць галасісты Максім Пашук.

Жодзішкаўскім артыстам апладзіравала публіка па ўсёй Беларусі і за яе межамі. Міжнародны фестываль-конкурс "Вясёлка над Віцебскам" у рамках "Славянскага базару", рэспубліканскае свята "Александрыя збірае сяброў", Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур у Гродне, абласныя "Дажынкі" — далёка не поўны пералік пляцовак, дзе "Вечарынка" дэманстравала таленты.

Побач з народным ансамблем нярэдка можна сустрэць узорны фальклорны калектыў "Нальшчаначка" Жодзішкаўскай СШ, на чале якога — Кацярына Дудзінская. "Нядзіўна, што дзеці ведаюць усе нашы песні, — усміхаецца Алена Давыдзенкава. — Такая вось пераемнасць пакаленняў, народных традыцый і культуры".

Галіна АНТОНАВА
Фота аўтара

Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2024 года

Адна з пераможцаў віктарыны ў Telegram-канале "Культура і Мастацтва" Яўгенія Дзеранок з Мінска

Газета "Культура"

Індывідуальны **63875** 1 мес. – 15,02 руб., 3 мес. – 45,06 руб., 6 мес. – 90,12 руб.

Ільготны ведамасны **638722** 6 мес. – 129,30 руб.

Ведамасны **638752** 1 мес. – 24,87 руб., 3 мес. – 74,61 руб., 6 мес. – 149,22 руб.

Індывідуальны льготны **63872** 6 мес. – 78,64 руб.

Ільготны (для юрыдычных асоб, якія афармляюць падпіску ў адрас сваіх супрацоўнікаў і пенсіянераў) **63879** 1 мес. – 16,96 руб., 3 мес. – 50,88 руб., 6 мес. – 101,76 руб.

Часопіс "Мастацтва"

Індывідуальны **74958** 1 мес. – 20,11 руб., 3 мес. – 60,33 руб., 6 мес. – 120,66 руб.

Ільготны ведамасны **749412** 6 мес. – 202,21 руб.

Ведамасны **749582** 1 мес. – 39,45 руб., 3 мес. – 118,35 руб., 6 мес. – 236,70 руб.

Індывідуальны льготны **74941** 6 мес. – 103,40 руб.

Ільготны (для юрыдычных асоб, якія афармляюць падпіску ў адрас сваіх супрацоўнікаў і пенсіянераў) **74986** 1 мес. – 22,21 руб., 3 мес. – 66,63 руб., 6 мес. – 133,26 руб.

Афіша з 3 па 10 лістапада

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"
г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2, тэл.: 8 0212 669077 (каса)

- Сакрэтная казка **"Мой вялікі маленькі Дзядуля" (5+). 5 лістапада 11.00.**
- Казка ў 2 дзеях **"Марозка" (3+). 12 лістапада ў 11.00.**

УНП 300001869

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20, тэл.: 8 017 3970163 (экскурсійнае бюро)

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Экспазіцыя **"Жыццё ў мініяцюры"**. Выставачны корпус, вул. К. Маркса, 24. **Да 19 лістапада.**
- Выстава **"Уладзімір Стэльмашонак. Сыны зямлі беларускай"** з фондаў музея, прымеркаваная да 95-годзя з дня нараджэння народнага мастака БССР, педагога Уладзіміра Іванавіча Стэльмашонка (1928 – 2013). **Да 20 лістапада.**
- Выстава **"Анталогія прыгажосці. Традыцыйны беларускі касцюм"** у рамках штогадовай акцыі "Вераснёвая ноч", прымеркаванай да Дня горада Мінска. **Да 11 снежня.**
- Выстава **"Нашы калекцыі. Французскае выяўленчае мастацтва са збору Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь". Да 15 студзеня 2024 года.**
- Экскурсіі: **"Самыя-самыя..." (6+), "Якога колеру зіма?" (6+), "Віды і жанры ў выяўленным мастацтве" (6+), "Казкі Усходу" (10+), "Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма" (10+), "Партрэты даўніх мінулых пакаленняў..." (10+), "Пяць моў кахання" (16+), "Жаночы партрэт" (16+), "Мінск у музеі" (16+). Праводзяцца заўсёды.**

УНП 100577771

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а, тэл.: 8 017 3637796, 8 017 3588878

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Экскурсіі **"Шлях мастака Валенціна Ваньковіча"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **"Сядзібны партрэт"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **"Інтэр'ер шляхецкай сядзібы"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100577771

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА
Мінскі р-н, Астрашыцка-Гарадоцкі с/с, в. Аколіца, вул. Іванаўская, 176, тэл.: 8 017 5074468

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Выстава з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.
- Праграма **"Каляды ў музеі". Праводзіцца заўсёды.** Працягласць – 2 – 2,5 гадзіны. Папярэдні запіс абавязковы.

УНП 100577771

МУЗЕЙ В. К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў МАГІЛЁВЕ
г. Магілёў, вул. Ленінская, 37, тэл.: 8 0222 650203, 8 0222 658800

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Выстава жывапісу, графікі, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, фотаздымкаў беларускіх творцаў XX–XXI стст. з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь **"Калі мы былі дзецьмі". Да 2 снежня.**
- Art-lectorium **"Зразумелае мастацтва". Праводзіцца заўсёды.**

Падрабязней на сайце artmuseum.by.

УНП 100577771

МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

г. Магілёў, вул. Першамайская, 7,
тэл.: 8 0222 656604 (каса),
сайт: mdrama.by

• Казка-страшылка **"Вучань ведзьмака, ці Бітва чарадзеяў" (6+)**. Гастролі Мінскага абласнога драматычнага тэатра (Маладзечна). **3 лістапада ў 11.00.**
• Камедыя **"Ну вы даяце!" (18+)**. Гастролі Мінскага абласнога драматычнага тэатра (Маладзечна). **3 лістапада ў 18.30.**
• П'еса-казка для дзяцей у 1 дзеі **"Чаму вымерлі дыназаўры?" (0+)**. **4 лістапада ў 12.00.**
• Сямейная камедыя ў 2 дзеях **"Мая жонка — ілгуння" (16+)**. **4 лістапада ў 18.30.**
• Камедыя для дзяцей і дарослых у 1 дзеі **"Казка пра каралеву, прынцэсу, рыцара і пачвару" (0+)**. **5 лістапада ў 12.00.**
• Камедыя ў 1 дзеі **"Прымакі" (16+)**. **5 лістапада ў 18.30.**
• Памылка доступу ў 1 дзеі **"Тэта ўсё яна" (16+)**. **8 лістапада ў 16.00.**
• Французская камедыя ў 2 дзеях **"Сем жанчын на шыі" (16+)**. **9 лістапада ў 18.30.**
• Камедыя **"Хітрыкі Скапена" (16+)**. **10 лістапада ў 18.30.**
• Музычная казка ў 1 дзеі **"Як Кашчэй Бессмяротны з Васілісай ажаніўся" (6+)**. **11 лістапада ў 12.00.**
• Камедыя ў 1 дзеі **"Настаўленне для ахвотных ажаніцца" (16+)**. **11 лістапада ў 18.30.**

УНП 700184039

РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44,
тэл.: 8 017 3859751 (каса),
8 029 1540444 (замова квіткоў)

• Спектакль для дзяцей і дарослых **"Гісторыя двух сабак" (6+)**. **3 лістапада ў 11.00.**
• Сатырычная камедыя **"Мудрамер" (16+)**. **3 лістапада ў 19.00.**
• Больш чым казка **"А мне не сорамна!.." (6+)**. **4 лістапада ў 12.00.**
• Ваенная аповесць **"Альпійская балада" (16+)**. **4 лістапада ў 19.00.**
• Гісторыя аднаго дома **"Карней" (16+)**. Прэм'ера. **5 лістапада ў 19.00.**
• Камедыя **"Тэсты для дарослых" (16+)**. **11 лістапада ў 19.00.**

УНП 100220213

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7,
тэл.: 8 017 3654237, 8 017 3576627,
пошта: kupalabilet@mail.ru

• Казка **"Гісторыя шакаладнага дрэва" (0+)**. Галоўная сцэна. **3 лістапада ў 11.30, 11 лістапада ў 11.30.**
• Спектакль у 2 дзеях **"Сакрамант лесу" (5+)**. Паводле казак Якуба Коласа. Галоўная сцэна. **3 лістапада ў 12.00.**
• Рэквіем у 1 дзеі **"Вечар" (12+)**. Галоўная сцэна. **3 лістапада ў 19.00.**
• Спектакль **"Магіла льва" (16+)**. Па матывах народнага падання і паэмы Я. Купалы. Галоўная сцэна. **4 лістапада ў 19.00.**
• Спектакль **"Брыдкае качаня" (6+)**. Галоўная сцэна. **5 лістапада ў 17.00.**
• Трагіфарс **Donna sola ("Жанчына адна") (18+)**. Камерная сцэна. **5 лістапада ў 19.00.**
• Трагікамедыя ў 2 дзеях па матывах твора У. Шэкспіра **"Рамэа і Джульета" (12+)**. Галоўная сцэна. **7 лістапада ў 19.00.**
• Камедыя ў 2 дзеях **"Паўлінка" (12+)**. Галоўная сцэна. **8 лістапада ў 19.00.**
• Містычная легенда пра каханне ў 1 дзеі **"Чорная панна Нясвіжа" (12+)**. Галоўная сцэна. **9 лістапада ў 19.00.**
• Трагікамедыя **"Апошні атракцыён" (16+)**. Галоўная сцэна. **10 лістапада ў 19.00.**
• Надзвычайна неверагоднае здарэнне ў 2 дзеях **"Жаніцьба" (12+)**. Галоўная сцэна. **11 лістапада ў 19.00.**
• П'еса **"Доўгі калядны абед" (16+)**. Гастролі Дзяржаўнага драматычнага тэатра на Васільеўскім (Санкт-Пецярбург, Расія). Спартыўна-культурны цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. **11 лістапада ў 19.00.**

УНП 100377901

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1,
тэл.: 8 017 2431041 (каса),
8 017 3615493

• Балет у 2 дзеях **"Лебядзінае возера" (12+)**. У дні школьных канікул. **3 лістапада ў 19.00.**
• Опера ў 2 дзеях **"Гісторыя Кая і Герды" ("Снежная каралева") (6+)**. У дні школьных канікул. **4 лістапада ў 18.00, 5 лістапада ў 11.00.**
• Балет у 1 дзеі па матывах рускіх народных казак **"Жар-птушка" (6+)**. У дні школьных канікул. **5 лістапада ў 18.00.**
• Балет у 1 дзеі **"Шэхеразада" (12+)**. У дні школьных канікул. **5 лістапада ў 18.15.**
• Канцэрт **"Чатыры сезоны кахання" (12+)**. Камерная зала імя Л. П. Александроўскай. **5 лістапада ў 18.30.**
• Балет у 2 дзеях **"Жызэль" (12+)**. **8 лістапада ў 19.00.**
• Опера ў 2 дзеях **"Чароўная флейта" (12+)**. **9 лістапада ў 19.00.**
• Балет у 2 дзеях **"Бахчысарайскі фантан" (12+)**. **10 лістапада ў 19.00.**
• Канцэрт **"У час шумнага балю..." (12+)**. Камерная зала імя Л. П. Александроўскай. **10 лістапада ў 19.30.**

УНП 191081322

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19,
тэл.: 8 01770 20602, 8 01770 20660,
8 029 5518051, 8 029 1903149

Палацавы ансамбль

• Экспазіцыя **"Летапіс праса: разгладзім старонкі"** з прыватнай калекцыі Барыса Васільева і Юліі Ржэўскай. Малая выставачная зала. **Да 12 лістапада.**
• Выстава **"Упершыню экспанат. З фонду Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж»"**, прысвечаная 30-годдзю ўстановы і 800-годдзю горада Нясвіжа. Вялікая выставачная зала. **Да 9 студзеня 2024 года.**
• Часовая экспазіцыя **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны". Да 13 кастрычніка 2024 года.**
• Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара"**. У складзе пастаяннай экспазіцыі.

Мерапрыемствы
• Квэст **"Палацавыя таямніцы"**.
• Віртуальныя выставы: **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны", "Нясвіж — здабытак сусветнай культуры", "Разбуральны след вайны ў архітэктуры Нясвіжа", "Шэдэўры калекцыі і ўнікальныя артэфакты музея-запаведніка «Нясвіж»"**.
• Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках Нясвіжа.

Ратуша (г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3)

Пастаянныя экспазіцыі
• **"Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII — 1-й палове XIX стст.".**
• **"Нясвіж у міжваенны час. Людзі і падзеі".**
• Калекцыя гадзіннікаў XIX—XX стст. **"Культура часу"**. З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы
• Квэсты: **"Безабліччны артэфакт", "Карта сямі каралеўстваў", "Музейны дэтэктыў", "Музейнае расследаванне"**.
• Культурныя мерапрыемствы: **"Прыём у княгіні", "Дзень нараджэння ў ратушы"** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў).
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **"Школа шпіёнаў"** (да 25 чалавек).
• Гульня-знаёмства **"Музейка аб музеі"** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
• Гульнявая праграма **"Выкрунтасы"** (група да 25 чалавек).

Падрабязнасці па тэлефонах 8 01770 20602, 8 01770 20660 або на сайце niasvizh.by.

УНП 600207920

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г. п. Мір, Карэліцкі р-н,
Гродзенская вобл.,
тэл.: 8 01596 36290,
8 01596 36270

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Мерапрыемства **"Восеньскія вакацыі ў музеі". Да 7 лістапада:**
— аглядныя экскурсіі па асноўнай музейнай экспазіцыі,
— тэматычная экскурсія для малодшых школьнікаў "Падарожжа ў часе",
— музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту,
— экскурсія з элементамі тэатралізацыі "Чароўная гісторыя ў Мірскім замку",
— інтэрактыўная фотапляцоўка.
• Часовая экспазіцыя **"Выстава абразоў з фондаў Карэліцкага раённага краязнаўчага музея" (0+)**. Царква-пахавальня князёў Святаполк-Мірскіх. **З 11 лістапада да 10 снежня.**
• Часовая экспазіцыя васковых фігур **"Тайная вячэра" (0+)**. **Да 10 снежня.**
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Экскурсія для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
• Квэст-экскурсія для ўсёй сям'і **"Легенды і паданні Мірскага замка"**.
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **"Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце", "Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст.", "Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст.", "Печы з каробкавай кафлі XVI—XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў"**.

УНП 590201541

Карыстаецеся стыкерамі ў анлайн-ліставанні і хочаце папоўніць сваю калекцыю? Прапануем стыкерпак ад "Культуры"! Выказаць эмоцыі вам дапамогуць класікі беларускай літаратуры. Выбірайце самую трапную цытату — і здзіўляйце суразмоўцаў у Telegram!

10 декабря 2023 года, 18.00,
МКСК "Минск-арена".
Стоимость билетов —
от 80 до 479 руб.
Билеты можно приобрести в кассах
Дворца Республики
(тел. 8 017 2299039,
факс 8 017 2299285)
и на сайтах:
ticketpro.by, kvitki.by.
Дополнительная информация
по тел. 8 017 2299163.

УНП 101361712

ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ ФІЛАРМОНІЯ

г. Віцебск, вул. Леніна, 69,
тэл. касы: 8 0212 368387,
сайт: vitebsk-fil.by

• Прадстаўленне **"КАРАМЕЛЬКА І ГАРОШЫНКА НА КАРЫБСКІХ АСТРАВАХ" (3+)** у межах праекта **"ФІЛАРМОНІЯ — ДЗЕЦЯМ"**. **6 лістапада ў 11.00.**
• Да Года міру і стварэння — прадстаўленне **"ГЕРОІ НАШАГА ЧАСУ" (3+)** у межах праекта **"ФІЛАРМОНІЯ — ДЗЕЦЯМ"**. **7 лістапада ў 11.00.**
• Новая імпрэза ў межах цыкла лекцый-канцэртаў **AD LIBITUM**, прысвечаная **ГАЛІНЕ ВІШНЕЎСКАЙ (6+)**. **9 лістапада ў 19.00.**
• **"20 АДЦЕННЯЎ КАХАННЯ"** — 15 гадоў на сцэне **ДЖУЛІЕТЫ ТАРАХЧАН (6+)**. **11 лістапада ў 19.00.**
• Прадстаўленне **"КАША З СЯКЕРЫ" (3+)** у межах праекта **"ФІЛАРМОНІЯ — ДЗЕЦЯМ"**. **12 лістапада ў 11.00.**

УНП 300149385

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8,
тэл.: 8 017 2030792, 8 029 1440792,
8 017 3271166

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Часовая экспазіцыя **"Адзінай памяці верныя"**, прысвечаная 80-годдзю з пачатку вызвалення Беларусі (23 верасня 1943 г.).
• Запрашаем юных наведвальнікаў у прастору **"Музей для дзяцей"** — гэта ўтульная атмасфера партызанскага лесу ў спалучэнні з сучаснымі тэхналогіямі, добрымі і ўважлівымі музейнымі педагогамі. Тут праходзяць заняткі і лекцыі, майстар-класы і інтэрактыўныя праграмы для хлопчыкаў і дзяўчынак і іх бацькоў. **Прастора працуе з серады па нядзелю!**
• **Квэсты** — гэта ўнікальнае пазнавальнае і захапляльнае падарожжа па музейных залах для арганізаваных груп наведвальнікаў (да 20 чалавек). Падчас квэстаў удзельнікі пашыраюць веды па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, выконваюць заданні і пераадольваюць розныя перашкоды.
Усяго прапануецца тры квэсты:
— **"Шлях да Перамогі"**, узрост удзельнікаў — ад 12 гадоў.
— **"Сумка з чырвоным крыжам"**, узрост удзельнікаў — ад 14 гадоў.
— **"Франтавы дзённік"**, узрост удзельнікаў — да 12 гадоў.

Падрабязнасці на сайце warmuseum.by.

УНП 100235472

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47,
тэл.: 8 017 2427814,
час працы: аўторак — нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Выстава па выніках Рэспубліканскага конкурсу **"Нацыянальная прэмія ў галіне выяўленчага мастацтва". Да 26 лістапада.**
• Курс **"Арт-азбука ў НЦСМ" (8+). Да 31 мая 2024 года.** Кожная сустрэча складаецца з тэарэтычнай часткі і творчых заняткаў. Яны праходзяць у інтэрактыўнай форме, удзельнікаў чакаюць практычныя заданні, майстар-класы, квэсты і гутаркі з мастакамі. Праграма курса пабудавана на работах, якія захоўваюцца ў фондзе ўстановы, сучасных беларускіх аўтараў. Працягласць аднаго занятку — 2 гадзіны. Колькасць удзельнікаў у групе — 10—12 чалавек. Перыядычнасць заняткаў — 2 разы на месяц па суботах. Кошт аднаго занятку — 15 рублёў. Абавязковая папярэдняя рэгістрацыя!

Дадатковая інфармацыя і запіс на курс па тэл.:
8 017 2350331, 8 017 3629336 (9.00—17.00).

УНП 192543414

*

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь

аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Тэлефоны: **8 017 3970163, 8 025 6677819**.

УНП 100377771

2006 2010 2022

КУЛЬТУРА

Сайт:
kultura-info.by
E-mail:
kim@kultura-info.by

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца на беларускай мове.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".

Дырэктар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Рэдакцыя газеты "Культура":

Галоўны рэдактар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна.

Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ.

Рэдактары аддзелаў — Віктар ГАУРЫШ, Яўген РАГІН.

Аглядальнікі рэдакцыі: Яўгенія ГАБЕЦ, Антон РУДАК, Ганна САКАЛОВА, Ільля СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ, Данііл ШЭЙКА, Зміцер ЮРКЕВІЧ, Настасся ЮРКЕВІЧ.

Рэдактар літаратурны — Мацвей ЗАЙЦАЎ.
Рэдактары мастацкія — Мікалай КАСЦЮКОЎ.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.

Тэлефоны:
8 017 2860797.
Тэлефон-факс: 8 017 3345741.
Бухгалтэрыя: 8 017 3345735.
Рэкламны аддзел: 8 017 2860797.

Падпісныя індэксы:
63875, 638752, 63879.
Ільготныя на паўгоддзе:
63872, 638722 (зніжка 15 %).
Камплект (газета "Культура" і часопіс "Мастацтва"):
63874, 638742 (зніжка 10 %).

Рознічны кошт — па дамоўленасці.

* — матэрыял на правах рэкламы.

Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Меркаванне аўтара можа не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

Падпісана ў друк 02.11.2023 у 16.00. Замова № 2615.
Наклад 3259.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва «Беларускі Дом друку»". 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.
ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

© "Культура", 2023.